Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ XXIV

№ 92 (6974)

ПЯТНІЦА 18 КРАСАВІКА 1941 г.

ЦАНА 15 КАП.

Сёння ў нумары

Справаздачна-выбарныя сходы партарганізацый.
М. Паўлючэнкаў.—Без зазнайства.
Г. Блюмкіна.—Чаму не працавала партбюро.
Г. Таран.—Аб чым гавораць цыфры і факты.
Гаспадарчы разлік у дэпо Жлобін-Паўночны.
І. Зеленко.—На шляху да рэнтабельнасці.
В. Паляшчук.—Па метаду Луніна.
І. Шульгоў.—Пры гаспадарчым разліку павялічваецца і заработак.
М. Кізееў.—Дружба паравознікаў і рамонтнікаў.
П. Шумскі.—Павысілася цікавасць да пытанняў эканомікі.
Усебакова развіваць грамадскую калгасную вытворчасць.
В. Гук.—Рассадзнік племянной конегаюўлі.
С. Махлай.—Зробім даходным кожны гектар зямлі.
Н. Гурыновіч.—Калгасная птушкаферма.
Н. Вішнеўскі, С. Казначэеў. — На ўздыме.
ЗА РУБЯЖОМ:
Водгукі замежнага друку на заключэнне совецка-японскага пакта аб нейтралітэце. — Вайна ў Еўропе і Афрыцы (дзённік ваенных дзеянняў). — Балгарыя парвала дыпламатычныя адносіны з Югаславіяй.

Важнейшая крыніца папаўнення калгасных ферм

XVIII Усесаюзная партыйная канферэнцыя намеціла велічную праграму развіцця ўсёй народнай гаспадаркі Совецкага Саюза на 1941 год. Вялікія задачы пастаўлены партыяй і ўрадам у галіне сельскай гаспадаркі. Наша краіна змагаецца за атрыманне ў гэтым годзе 7 мільярдаў 900 мільёнаў пудоў зярна. План развіцця народнай гаспадаркі прадугледжвае таксама далейшы няўхільны рост калгаснай грамадскай жывёлагадоўлі. Пагалоўе буйнай рагатай жывёлы павінна сёлета ўзрасці на 19 проц., у тым ліку кароў на 24—25 проц., авечак і коз на 23—24 проц., свіней на 38 проц. і коней на 9—10 процантаў.

Гэта вялікае і адказнае заданне партыі і ўрада. Для таго, каб яго з чэсцю выканаць, нашым партыйным і совецкім арганізацыям, зямельным органам і кіраўнікам калгасаў трэба многа і сур'ёзна патоцапаваць.

Нашы поспехі ў развіцці грамадскай жывёлагадоўлі агульнавядомы. Пераважная большасць калгасаў рэспублікі цяпер мае па тры і больш жывёлагадоўчых ферм. Праведзена значная работа па паляпшэнню пароднасці жывёлы і па павышэнню яе прадуктыўнасці. Але тэмпы прыросту пагалоўя ў многіх раёнах і абласцях рэспублікі далёка не адпавядаюць задачам, пастаўленым XVIII з'ездам ВКП(б). У нас ёсць нямала яшчэ карлікавых, неўкамплектаваных калгасных ферм.

Соўнарком БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове «Аб стане грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах БССР» адзначылі буйнейшыя недахопы ў развіцці жывёлагадоўлі і патрэбавалі «ад усіх партыйных, совецкіх і зямельных органаў, кіраўнікоў соўгасаў, МТС і калгасаў неадкладных і канкрэтных дзеянняў па ліквідацыі наяўных недахопаў у развіцці жывёлагадоўлі і забеспячэнні тэмпаў прыросту пагалоўя жывёлы ў калгасных фермах, устаноўленых XVIII з'ездам ВКП(б) на першым трэцяй пяцігодкі».

Важнейшай і асноўнай крыніцай папаўнення калгасных жывёлагадоўчых ферм з'яўляецца поўнае захаванне маладняка прыплоду гэтага года. У тых калгасах, дзе правільна зразумелі гэту задачу, быстра ідзе расшыранае ўзнаўленне грамадскага стада. Зараз на калгасных фермах адбываюцца масавыяацёлы, акоты і апаросы жывёлы. Поспех выканання дзяржаўнага плана развіцця грамадскай жывёлагадоўлі на 1941 год поўнасцю залежыць ад таго, як мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі мабілізуюць масы калгаснага сялянства на захаванне і вырошчванне маладняка.

Пасля апублікавання пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі па Беларускай ССР на калгасных жывёлагадоўчых фермах прыкметна палепшыўся догляд за маладняком. Нямала работнікаў калгаснай жывёлагадоўлі на справе адчулі вялікую сілу рашэння партыі і ўрада аб дадатковай аплаце працы. Многія работнікі ферм атрымалі дадатковую аплату за поўнае захаванне маладняка. Так, напрыклад, даярка-скотніца сельскагаспадарчай артэлі «Саюз». Бярэзінскага раёна, Анна Давідовіч ад замацаваных за ёю 15 кароў атрымала сёлета прыплод 15 пялят і поўнасцю іх захавала да 20-дзённага ўзросту. За сваю чэсную работу яна атрымала дадатковую аплату ў памеры 60 літраў малака. Дадатковую аплату поўнага за поўнае захаванне маладняка атрымалі таксама і калгасніцы сельгасарцелі «Сцяг Кастрычніка», таго-ж Бярэзінскага раёна, Вера Аўтуховіч і Елена Ермаловіч.

Поўнасцю захаваць увесь маладняк — важнейшая задача кожнага калгаса і соўгаса. Мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі, работнікі зямельных органаў павінны аказаць ім у гэтым актыўную дапамогу. Нецярпімая з'ява, калі асобныя райкомы партыі і райвыканкомы не клапоцяцца аб захаванні маладняка ў калгасах. Абыякавыя адносіны да такой важнай справы дорага каштуюць дзяржаве. Факты гавораць аб тым, што ў асобных месцах дапускаюць адыход маладняка. Напрыклад, у Халопеніцкім раёне, Мінскай вобласці (сакратар райкома КП(б)Б тав. Пінскі, старшыня выканкома райсовета тав. Лагойскі), робяць выгляд, што яны вельмі многа займаюцца пытаннямі развіцця грамадскай жывёлагадоўлі. На справе-ж гэтага няма і ў памяне. Тут далёка яшчэ не закончана ўкамплектаванне калгасных ферм. Не вядзецца барацьба за захаванне маладняка. На калгасных фермах дрэнна арганізаван прыём ацёлаў, акотаў і апаросаў. Толькі за апошні час на фермах пала 45 пялят і 135 ягнят. У калгасе «Чырвоны барацьбіт», Грыцкаўскага сельсовета, за люты і сакавік пала 18 пялят, у калгасе «Новае жыццё» — 6 пялят і 9 парасят. У чым-жа прычына адыходу маладняка? Аказваецца ў калгасах раёна не захоўваюцца самыя элементарныя правілы догляду за жывёлай. У тым-жа калгасе «Новае жыццё» каровы і свінні стаяць у гразі, тут-жа праходзяць ацёлы і апаросы.

Не вядзецца барацьба за захаванне маладняка і ў Лагойскім раёне. За першы квартал тут таксама дапушчан вялікі адыход маладняка.

Як вядома, у мінулым годзе па Магілеўскай вобласці быў значны адыход пялят і парасят. Сігналы з Чавускага, Шклоўскага і Дрыбінскага раёнаў паведамляюць, што ў Магілеўскай вобласці не зрабілі неабходных вывадаў з горкіх урокаў мінулага года. Тут зноў паўтараюцца мінулагодніх памылкі: дапускаецца адыход маладняка.

Вялікае значэнне для росту пагалоўя жывёлы ў калгасах мае капітрактацыя маладняка ў калгаснікаў і не членаў калгасаў. Але гэтаму важнейшаму мерапрыемству на месцах не ўдзяляюць дастаткова ўвагі. Капітрактацыя маладняка ў раёнах рэспублікі праходзіць незадавальняюча.

Кожны калгас мае ўсе магчымасці поўнасцю захаваць маладняк. Аб гэтым з усёй пераканаўчасцю сведчыць прыклад перадавікоў жывёлагадоўлі. Сотні перадавых жывёлаводаў рэспублікі за апошнія гады дабіліся выдатных рэзультатаў у вырошчванні і захаванні маладняка. Напрыклад, свінарка калгаса «Першае мая», Касцюковіцкага раёна, Ульяна Бабоша поўнасцю ліквідавала адыход маладняка. Не ведае адыходу жывёлы і знатная свінарка калгаса «Першае мая», Слуцкага раёна, Ольга Цытанова. Цялятніца калгаса «9 студзеня», Дзержынскага раёна, Марыя Снежко за 10 год сваёй работы вырасціла і поўнасцю захавала больш 500 пялят. У кожным раёне знойдзецца нямала калгасаў, жывёлагадоўчых ферм, дзе звялі да мінімума адыход маладняка. Вопыт гэтых калгасаў і асобных перадавікоў жывёлагадоўлі трэба паўсямесна скарыстаць.

Вялікая адказнасць за поўнае захаванне маладняка ўскладаецца не толькі на кіраўнікоў калгасаў, раёнаў, але і на спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Работнікі калгаснай жывёлагадоўлі маюць права чакаць ад нашых зоатэхнікаў, ветэрынарных работнікаў неабходнай дапамогі.

Поўнае захаванне і вырошчванне ўсяго маладняка прыплоду гэтага года — важнейшая задача работнікаў соцыялістычнай жывёлагадоўлі, усіх сельскіх партыйных і совецкіх арганізацый, кіраўнікоў зямельных органаў і калгасаў.

САМАЛЁТ ЧЭРАВІЧНАГА ВЯРНУЎСЯ НА ВОСТРАЎ ВРАНГЕЛЯ

К вечару 16 красавіка на дрэйфуючай «Крыле № 2», дзе амаль чэцвера сутак правялі ўдзельнікі высокашыротнай паветранай экспедыцыі, усе прыгатаўленні да старта былі закончаны.

17 красавіка ў 00 гадзін 40 мінут па маскоўскаму часу самалёт «СССР Н-169» адарваўся ад лёдзянога аэрадрома. Неўзабаве ў Маскве была прынята радыёграма на імя тав. Папаніна: «Ідзем на Врангель. Чэравічны».

Палёт працякаў ва ўмовах здавальняючай відзімасці. У дарозе экіпаж вёў нагляд за станам ільдоў.

У 6 гадзін 50 мінут «СССР Н-169» прызямліўся на востраве Врангеля.

Тут удзельнікі высокашыротнай экспедыцыі прабудуць некалькі дзён, а затым зноў вылецяць для правядзення навуковых работ на дрэйфуючай крыле. Прыкладны пункт трэцяй пасадкі:—80 градусаў паўночнай шыраты і 170 градусаў заходняй даўгаты. (ТАСС).

НАПЯРЭДАДНІ 100-годдзя З ДНЯ СМЕРЦІ М. Ю. ЛЕРМАНТАВА

Пасяджэнне Прэзідыума Усесаюзнага юбілейнага камітэта

17 красавіка ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў пад старшынствам тав. А. Фадзеева адбылося пасяджэнне Прэзідыума Усесаюзнага юбілейнага Лермантаўскага камітэта.

Ва ўсіх саюзных рэспубліках рыхтуюцца адзначыць мінаючае ў лістападзе 100-годдзе з дня гібелі вялікага рускага паэта. У Грузіі і Латвіі выдаюцца поўныя зборы твораў Лермантава, у Арменіі, Эстоніі, Азербайджане, Літве і на Украіне падрыхтоўваюцца выданні выбраных твораў паэта і яго асобных паэм. Творы Лермантава зараз перакладаюцца ў Татарыі, Бурат-Манголіі, Якуціі, Чачэна-Інгушэціі, Паўночнай Асеціі, Кабардзіна-Балкарыі і ў іншых рэспубліках — усяго больш як на 20 мовах народаў СССР. У школах і клубах арганізуюцца літаратурныя вечары, конкурсы і т. д.

У Маскве, Ленінградзе, Тбілісі, Орджанікідзе і іншых гарадах ствараюцца юбілейныя выстаўкі. Цэнтральны дом мастацкага выхавання дзяцей арганізуе ўсесаюзную выстаўку дзіцячай творчасці.

Усесаюзны Лермантаўскі камітэт абмеркаваў план вялікіх юбілейных выданняў. Дзяржлітвыдат выпускае поўны збор твораў Лермантава ў чатырох томах (частка тыража ўжо выпушчана); у маі пачнецца друкаванне аднатомніка, які выйдзе да юбілея тыражом у 300 тысяч экземпляраў. Па 100 тысяч экземпляраў выдаюцца лермантаўская лірыка, паэмы.

У бліжэйшы час выходзіць зборнік артыкулаў аб Лермантаве, падрыхтаваны Інстытутам сусветнай літаратуры ім. Горкага.

У лермантаўскія дні ў тэатрах краіны будзе дадзена 114 юбілейных спектакляў. (ТАСС).

НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЯХ

АСТРАШЫЦКІ ГАРАДОК. (Мінскі раён). Землі ў калгасах Астрашыцка-Гарадзецкага сельсовета гарыстыя, пясчаныя. На такіх землях вельмі важна разняй вясной захаваць ад выпарвання накапіўшуюся за восень і вясну вільгаць. Таму калгаснікі, не чакаючы паўсямеснага надсыхання глебы, 17 красавіка выбарачным парадкам прыступілі да палявых работ. У гэты дзень у калгасах імені Сталіна і «Новы шлях» ішло баранаванне зяблёва. У калгасе імені Молатава на ворыве працавала 9 параконных плугоў.

***

БЕЛАСТОК, 17 красавіка. (Кар. «Звязды»). У Беластоцкай вобласці ўстанавілася цёплае сонечнае надвор'е. Зямля ўжо прасохла на многіх масівах. Амаль ва ўсіх раёнах вобласці пачалося ворыва і сяўба яравых культур. Калгас імені Дзержынскага, Ломжанскага раёна, ужо засеяў 10 гектараў канюшыны, 2 гектары серадэлы, 20 гектараў аўса. Пачалі сяўбу аўса калгасы «Чырвоная звязда», «Чырвоны Нёман», Скідэльскага раёна, «Свабодная Беларусь», Гродненскага раёна. 207 трактараў машынна-трактарных станцый вобласці ўключыліся ў вясеннія работы на палях калгасаў і аднаасобных гаспадарак.

***

ПІНСК. (Кар. «Звязды»). Ва ўсіх раёнах вобласці разгарнуліся масавыя палявыя работы. Калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі рыхтуюць глебу, праводзяць сяўбу зернавых, робяць падкормку азімых.

Калгас імені Молатава, Целеханаўскага раёна, ужо засеяў 3 гектары аўса, рыхтуе глебу для сяўбы ячменю і бульбы. 8 гектараў аўса засеяў калгас «Шлях да комунізма». Прыступілі да сяўбы таксама калгасы імені Карла Маркса і «17 верасня».

У Іванаўскім раёне выйшлі на поле ўсе калгасы. Сельгасарцель «Чырвоная звязда», Застружскага сельсовета, ужо засеяла 15 гектараў аўса. Пасеў праведзен добраякасна. 12 гектараў аўса і 4 гектары ільну пасеяў калгас імені Сталіна. У калгасе імені Варашылава, Псышчанскага сельсовета, засеяна 10 гектараў аўса і 7 гектараў ільну.

Усяго па вобласці засеяна 616 гектараў яравых і 5 гектараў бульбы.

II з'езд саюза совецкіх архітэктараў БССР

17 красавіка ў мінскім Доме пісьменніка адкрыўся II з'езд саюза совецкіх архітэктараў БССР. У яго рабоце прымаюць удзел дэлегаты ад буйнейшых гарадоў рэспублікі—Мінска, Беластока, Гомеля, Віцебска, Магілева, а таксама архітэктары Масквы, Ленінграда, Латвійскай, Літоўскай і Армянскай ССР. Прысутнічаюць шматлікія госці—архітэктары, інжынеры, мастакі і скульптары.

У дзелавы прэзідыум выбіраюцца таварышы Папамарэнка, Кулагін, Былінскі, Ваняеў, Эйдзінаў, Малін, Гарбуноў, Ганенка, І. Захараў, Колышкін, Рыўкіна, Чорны, Кручкоў, Бударын, Забелло, Маркелаў, архітэктары Брэйман, Воінаў, Батоева, Лангбард, Рубаненка, Пекалок, Паэгле, Кудзкас, Плаўцінш, Мхітар'ян.

З вялікім уздымам дэлегаты выбіраюць пачотны прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным, а таксама таварыша Тімашэнка.

Старшыня праўлення саюза совецкіх архітэктараў БССР тав. Брэйман у сваім дакладзе расказаў з'езду аб творчым росце беларускіх архітэктараў.

— Пудоўныя будынкі мінскага акрутовага Дома Чырвонай Арміі, Дома партыйных курсаў, Палаца піянераў, Інстытута фізкультуры і рад іншых буйнейшых аб'ектаў у гарадах БССР пабудаваны па праектах А. П. Воінава, В. Н. Вараксіна, І. Г. Лангбарда, А. Е. Кудравіцкага, О. П. Батоевай, Р. Е. Столера і іншых архітэктараў.

БССР займае адно з першых месц у Саюзе па планіроўцы гарадоў. Амаль няма ні аднаго горада ў рэспубліцы, які не меў-бы генеральнага праекта планіроўкі. У Мінску ўпершыню пасля зацвярджэння генеральнай схемы пачынаецца арганізаваная забудова асноўных магістралей горада. Зусім мяняюць сваё аблічча вуліцы Совецкая, Доўгабродская, Пушкіна, Карла Маркса; ствараецца новы ансамбль Прывакзальнай плошчы.

Дакладчык падкрэслівае, што грандыёзны размах будаўніцтва ў БССР ставіць вялікія задачы перад прамысловасцю буданічных матэрыялаў. Трэба выпускаць больш будаўнічай прадукцыі і архітэктурных дэталей, тыповых канструкцый, сталярных вырабаў. Гэта пытанне набывае зараз асаблівую актуальнасць у сувязі з разгортваннем скараснага будаўніцтва.

Разам з тым дакладчык ставіць пытанне аб творчым супрацоўніцтве архітэктараў і мастакоў. Прыклад правільнага спалучэння работы архітэктара і мастака паказвае супрацоўніцтва архітэктара І. Г. Лангбарда са скульптарам А. О. Бембелем па афармленню Дома Урада БССР, тэатра Чырвонай Арміі ў Мінску і інш.

— Архітэктары БССР павінны весці далейшую барацьбу за павышэнне архітэктурнай культуры і майстэрства,—гаворыць у заключэнне тав. Брэйман.

— Трэба будаваць хутчэй, лепш і танней. Архітэктары, натхнёныя штодзённымі клопатамі партыі і ўрада, з'явяцца правадніками перадавой будаўнічай тэхнікі і культуры і створаць новыя пудоўныя будынкі, дастойныя вялікай сталінскай эпохі.

З дакладам аб рабоце рэвізійнай камісіі выступіла старшыня рэвізійнай камісіі О. П. Батоева.

Удзельнікаў з'езда горача віталі госці з брацкіх рэспублік — А. К. Плаўцінш (Латвійская ССР), М. О. Мхітар'ян (Армянская ССР) і С. С. Кудакас (Літоўская ССР).

З вялікім уздымам дэлегаты з'езда прынялі тэкст прывітальнай тэлеграмы правадыру народаў таварышу Сталіну.

У рабоце з'езда прымаюць удзел сакратары ЦК КП(б)Б тт. Гарбуноў і Ганенка.

18 красавіка з'езд прадаўжае сваю работу. (БЕЛТА).

Акруговая канферэнцыя рацыяналізатараў і вынаходцаў

У мінскім Доме Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава адбылася канферэнцыя рацыяналізатараў і вынаходцаў Заходняй Асобай Ваеннай Акругі. Кароткай уступнай прамовай канферэнцыю адкрыў тав. Фаміных.

З дакладам аб стане і задачах рацыяналізатарскай і вынаходніцкай работы ў акрузе выступіў тав. Болдзін.

За апошнія годы рацыяналізатарская і вынаходніцкая работа ў часцях акругі значна шагнула ўперад. Дастаткова сказаць, што ў 1940 годзе паступіла 820 рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходстваў, з якіх 538 рэалізавана. У ліку іншых выключную каштоўнасць прадстаўляе сканструіраваны ваентэхнікам 1-га ранга тав. Зверко тэлефон для падводнікаў. Гэта вынаходства атрымала ўсеагульнае адабрэнне.

Дакладчык прывёў у прыклад мноства ваенных часцей, дзе ваенныя рацыяналізатары і вынаходцы акружаны штодзённай увагай, назваў прозвішчы чырвонаармейца Банцікава, курсанта Канстанцінава, лейтэнанта Рыўкіна, ваентэхніка 1-га ранга Казлова і іншых, рацыяналізатарскія прапановы і вынаходствы якіх з'яўляюцца вялікім укладам у справу далейшага тэхнічнага аснашчэння Чырвонай Арміі. Тав. Болдзін падрабязна спыніўся на задачах рацыяналізатараў і вынаходцаў акругі і ўказаў на неабходнасць стварэння ім усіх патрэбных умоў для плённай работы.

Па дакладу тав. Болдзіна разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступіўшыя дэлегаты расказалі аб рабоце лепшых рацыяналізатараў і вынаходцаў часцей акругі, звярнулі ўвагу на неабходнасць значнага палепшання кіраўніцтва вынаходніцтвам.

Канферэнцыя прыняла зварот да ўсіх рацыяналізатараў і вынаходцаў ЗахАВА. Лепшыя рацыяналізатары і вынаходцы прэміраваны Ваенным Советам акругі.

З вялікім уздымам канферэнцыя прыняла прывітальную тэлеграму Наркому абароны СССР Герою і Маршалу Совецкага Саюза тав. Тімашэнка.

ШАХМАТНЫ МАТЧ-ТУРНІР

Учора ў 15-м туры Смыслоў і Батвінік разыгралі іспанскую партыю. Смыслову ўдалося арганізаваць атаку пазіцыі праціўніка, аднак ён іграў недакладна, і ініцыятыва перайшла да гросмейстара. Партыя адкладзена ў складаным становішчы з некаторай перавагай для Батвініка.

Бандараўскі і Лілієнталь разыгралі дэбют чатырох капей. Бандараўскі разгарнуў атаку і здавалася, што праціўнік яго павінен прайграць. Але і гэта атака была праведзена недакладна.—Лілієнталь абараніўся, астраумным манёўрам захапіў ініцыятыву, потым дабіўся двух прахадных пешак; супроць іх Бандараўскі рашыў не змагацца і здаўся.

Партыя Керэс—Балеслаўскі адкладзена з лішняй пешкай і шансамі на выйгрыш у Балеслаўскага.

Такім чынам, і гэты тур не стварыў патроз лідэрству гросмейстара Батвініка.

Сёння — дзень адгрывання адкладзеных і прапушчаных партый.

XII ШАХМАТНЫ ЧЭМПІЯНАТ БССР

У чэмпіянаце рэспублікі сыграны тры туры, і ўжо можна сказаць, што няма нікога, хто-б выдзяляўся добрай падрыхтоўкай і мог змагацца супроць кандыдатуры майстра Верасава на званне чэмпіёна рэспублікі.

У другім туры (16 красавіка) выйгралі белымі Левітас—у майстра Сіліча і Барын—у Серабрыйскага; чорнымі—Верасаў у Насцюшонка і Жудро ў Заблудоўскага. Партыя Сташэўскі—Майзін адкладзена з лішнімі фігурай і пешкай, у апошняга.

Учора ў трэцім туры майстар Верасаў выйграў у свайго вучня Райнфельда 2 пешкі, але даў яму магчымасць стварыць атаку на кароля. Абарона была магчыма, але майстар прагледзеў яе і павінен быў аддаць ферзя за ладдзю і каня, растраціўшы і пешкі. Райнфельд меў усе шансы на выйгрыш, але майстар прапанаваў нічыю, і.. яна была прынята.

Зісман выйграў у Шпігельмахера, майстар Сіліч—у Барына. Майзель не змог давесці атрыманую ім перавагу да перамогі над Заблуўоўскім, і партыя закончылася нічыёй. Адна партыя не ігралася, дзве адкладзены.

Сёння іграецца чацверты тур.

ПЕРАДМАЙСКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

ЗА ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ СВЯТА

ЗахАВА, (БЕЛТА). У часцях Заходняй Асобай Ваеннай Акругі шырока разгарнулася перадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва. Увесь асабовы састаў часцей змагаецца за дастойную сустрэчу радаснага свята.

У Н-скай часці з кожным днём павялічваецца колькасць выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі. На паверачных занятках падводзяцца папярэднія вынікі спаборніцтва.

На агнявым рубяжы — байцы падраздзялення тав. Чэрвінскага. Першым паснайперску страляе камандзір узвода тав. Васіленка. Байцы следуюць прыкладу камандзіра. Яны паражаюць мішэні з першага выстралу. Гэта падраздзяленне з'яўляецца перадавым. За выдатныя дасягненні ў аўладанні ваеннай справай і палітычнымі ведамі чырвонаармейцы тт. Фокін, Тупіцын, Варонін, Іосельян, Кутаталадзе занесены на дошку пачоту.

***

ЗахАВА, (БЕЛТА). Пяршынства ў перадмайскім соцыялістычным спаборніцтве ў Н-скай часці ЗахАВА ўпорна заваёўвае аддзяленне тав. Каралёва. Днямі адбылася праверка агнявой вывучкі байцоў. Усе чырвонаармейцы аддзялення тав. Каралёва метка паражалі мішэні. Выдатных паказальнікаў дабіліся байцы тт. Каламейчук, Абрамаў, Якаўлеў, Рудаў і іншыя.

Новыя рэкорды віцебскіх чулочніц

ВІЦЕБСК, 17 красавіка. (БЕЛТА). Першамайскае свята стахановцы чулочна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» сустракаюць новымі рэкордамі прадукцыйнасці працы. Учора на другой змене стахановка кецельнага цэха Ефрасінья Праварынская закетлявала 1060 пар мужчынскіх наскоў 69 артыкула пры норме 505 пар, устанавіўшы такім чынам новы ўсесаюзны рэкорд прадукцыйнасці працы на гэтым працэсе.

Небывала высокай выпрацоўкі дабілася таксама маладая кецельшчыца Надзежда Сідарэнка, якая выпрацавала за змену 1100 пар дзіцячых чулкоў 13 размеру пры норме ў 560 пар.

Абавязацельствы выконваюць з чэсцю

ГОМЕЛЬ, 17 красавіка. (Кар. «Звязды»). Сярод работнікаў Днепра-Дзвінскага пароходства разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу дня Першага мая. Ініцыятарам соцыялістычнага спаборніцтва на лепшае правядзенне навігацыі з'яўляецца каманда парахода «Беларусь». Узятыя на сябе абавязацельствы калектыў парахода выконвае з чэсцю. Пароход працуе без перабояў, перавыконвае план. За першую дэкаду сваёй работы каманда парахода выканала заданне на 105 проц. Графік руху не быў парушан.

Узоры стаханаўскай работы паказвае таксама каманда парахода «В. Ульянов». Спаборнічаючы з камандай парахода «Владимир Маяковский», яна змагаецца за датэрміновае выкананне навігацыйнага задання. 12 красавіка пароход адправіўся ў Лоеў. Па плану трэба было зрабіць 12.996 тонакілометраў, зрабіла-ж каманда 20.520 тонакілометраў, выканаўшы заданне на 160 процантаў.

Воднікі змагаюцца за датэрміновае выкананне красавіцкага навігацыйнага плана.

***

БАБРУЙСК, 17 красавіка. (БЕЛТА). Уключыўшыся ў перадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва, калектыў фанернага завода імені Кірава дабіўся значных поспехаў. За першую дэкаду план выкананы на 102,8 проц., па лушчэнню фанеры — на 110,5 проц. і па дубовай нажавой фанеры — на 118,6 проц. Перавыконваецца штодзённа план і ў другой дэкадзе.

Вялікіх поспехаў дабіліся рабочыя, выпускаючыя фанеру вышэйшых сартоў. 15 красавіка яны датэрмінова выканалі месячны план па клейшы.

Вырасла колькасць стаханаўцаў. Іх цяпер на заводзе 434 чал., замест 370 ў сакавіку. Лушчыльшчыкі тт. Чабатароў і Ханенка, пакавальшчыцы тт. Чыжонак, Астрэйка і многія іншыя сістэматычна выконваюць нормы на 170—185 проц.

***

Машыністы Мінскага паравознага дэпо ўзялі абавязацельства да свята зэканоміць не менш 50 тон паліва, вялізць паязды строга па раскладу з перавыкананнем вагавых норм.

Свае абавязацельствы паравознікі выконваюць з чэсцю. За 15 дзён красавіка яны даставілі звыш нормы 7 тысяч тон грузаў і зэканомілі 25 тон паліва. Лепшых паказальнікаў дабіліся машыністы тт. Сліч, Крайко, Бойкаш і Белеў. (БЕЛТА).

ТЭЛЕГРАМЫ

ГУТАРКА РУЗВЕЛЬТА З КАНАДСКІМ ПРЭМ'ЕРАМ

НЬЮ-ЙОРК, 17 красавіка. (ТАСС). Паводле паведамлення газеты «Нью-Йорк таймс», учора канадскі прэм'ер-міністр Кінг меў гутарку з Рузвельтам. У дыпламатычных кругах заўважаюць, што ў бліжэйшыя шэсць месяцаў Канада вычарпае свой запас валюты і таму яна просіць ЗША прадаставіць ёй пазыку або аказаць дапамогу на аснове закона аб перадачы ў арэнду або ў пазыку ўзбраеньняў.

Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, у інфарміраваных крутах лічаць, што Кінг і Рузвельт, магчыма, абмеркавалі пытанне аб перагляде закона аб нейтралітэце, каб даць магчымасць ЗША прадаставіць пазыку Канадзе (закон аб нейтралітэце забараняе прадастаўленне пазык ваюючым краінам).

Паводле паведамлення газеты «Нью-Йорк геральд трыбюн», у канадскіх кругах заявілі, што Канада зможа фінансіраваць свае ваенныя мерапрыемствы ў 1941 годзе, але яна будзе мець патрэбу ў дапамозе ў 1942 годзе. Рузвельт і Кінг абмеркавалі магчымасці змены закона аб нейтралітэце, каб дазволіць суднам ЗША заходзіць у Галіфакс (Новая Шатландыя).

ТЭРАРЫСТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЛЕГІЯНЕРАЎ У РУМЫНІІ

БУХАРЭСТ, 17 красавіка. (ТАСС). 15 красавіка румынскія газеты паведамілі аб забойстве буйнага кнігагандляра Макса Лондана, які быў застрэлян у сваім доме ў прысутнасці членаў сям'і з'явіўшыміся да яго маладымі людзьмі. Забойцы прабавалі ўцячы, але былі арыштаваны.

У сувязі з гэтым забойствам газеты публікуюць афіцыяльнае камюніке прэфектуры паліцыі Бухарэста.

Як гаворыцца ў камюніке, расследаваннем устаноўлена, што забойцы — Алесандэр Нікулеску і Канстанцін Іонеску — належаць да членаў легіянерскай арганізацыі «атрад смерці».

«Забойства, — указваецца ў камюніке, — было зроблена па загаду легіянерскай арганізацыі, да якой яны належаць, з мэтай даведацца, як будуць рэагаваць улады на легіянерскія тэрарыстычныя акты. Меркавалася правесці цэлы рад замахаў на дзяржаўных дзеячоў у час рэлігійных богаслужэнняў у вербную нядзелю. Злачынства было зроблена ў мэтах «падрыхтоўкі» і для праверкі тых, якія павінны былі зрабіць пралстаячыя забойствы».

Афіцыяльна паведамлена, што забойцы Макса Лондана па прыгавору суда расстраляны.

КАМЮНІКЕ АНГЛІЙСКАГА КАМАНДАВАННЯ НА БЛІЖНІМ УСХОДЗЕ

ЛОНДАН, 17 красавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае з Каіра камюніке англійскага камандавання на Бліжнім Усходзе, у якім паведамляецца, што ў Грэцыі напісак праціўніка ўзмацняецца па ўсяму фронту.

У Лівіі адзін англійскі патруль зрабіў паспяховую вылазку за лінію абароны Тобрука, захапіўшы ў палон 7 італьянскіх афіцэраў і 139 салдат. Новыя атакі на абарону Тобрука былі адбіты агнём артылерыі; праціўнік панёс цяжкія страты. Усяго за учарашні дзень англійскія войскі ўзялі ў палон 25 афіцэраў і 767 радавых. Атрача таго, праціўнік пакінуў на полі бою больш 200 забітых. У раёне Солума англійскія патрулі дзейнічаюць выключна актыўна. У адной са схватак вялікі атрад праціўніка быў засцігнут знянацку і панёс цяжкія страты.

У Абісініі нашы калоны наблізіліся к Дэсі. Тут таксама ўзяты палонныя. Агульная колькасць палонных, перакінутых у Адыс-Абебу, дасягнула 9000, з якіх 5000—італьянцы.

БАЛГАРЫЯ ПАРВАЛА ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ З ЮГАСЛАВІЯЙ

САФІЯ, 16 красавіка. (ТАСС). Як паведамляе Балгарскае тэлеграфнае агенцтва, балгарскі ўрад 15 красавіка заявіў аб разрыве дыпламатычных адносін з Югаславіяй.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

ВІШЫ, 16 красавіка. (ТАСС). Па апошніх статыстычных даных, кала 53 проц. французскіх сямей не маюць ні аднаго дзіцяці, 23 проц. — адно дзіця, 13 проц. — 2 і 6 проц. — 3. Чацвёра дзяцей маюць усяго каля 3 проц. сямей.

КАБУЛ, 16 красавіка. (ТАСС) Паводле паведамлення друку, уладальнікі двух тэкстыльных фабрык у Бангалоры (Індыя) аб'явілі локаут у адказ на забастоўку чатырох тысяч рабочых, патрабуючых павелічэння зарплаты. У Пуні таксама забастовала 400 рабочых, патрабуючых павелічэння зарплаты ў сувязі з дарагавізнай.

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ СХОДЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

БЕЗ ЗАЗНАЙСТВА

Днём комуністы калгаса «III Інтэрнацыянал» працавалі ў полі. Вечарам дакладна ў вызначаны час усе яны сабраліся, каб абмеркаваць справаздачу аб праробленай за год рабоце і правесці выбары сакратара пярвічнай партарганізацыі. Амаль усе комуністы калгаса — 6 членаў і 3 кандыдаты працуюць на вытворчасці.

Непасрэдны ўдзел у вытворчай рабоце дазваляе комуністам уваходзіць ва ўсе калгасныя справы, быстра і чотка выконваць задачы, якія стаяць перад калгасам. На кожным участку калгаснай вытворчасці алчуваецца ўплыў пярвічнай партарганізацыі. Калгас, які зусім нядаўна быў адным з адстаючых у раёне, дабіўся значных поспехаў.

Пярвічная партарганізацыя за справаздачны перыяд правяла 23 сходы, з іх 11 адкрытых. На сходах стаялі пытанні аб умацаванні працоўнай дысцыпліны, аб развіцці жывёлагадоўлі, аб мясцовай прамысловасці, партыйнай вучобе і т. д.

З пачуццём законнай гордасці гаварылі комуністы аб працвітанні свайго калгаса. Вось ужо траці раз калгас «III Інтэрнацыянал» будзе ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У 1940 годзе на ўсіх участках работы паказальнікі былі значна вышэй, чым у 1939 годзе. Не гледзячы на тое, што ў мінулым годзе ад стыхійнага бедства прапала каля 100 гектараў жыта, калгаснікі сабралі зернавых на 650 цэнтнераў больш чым у 1939 годзе. Грашовы даход за гэты ж перыяд павялічыўся на 55 тысяч рублёў. Павысіўся і прападзень калгаснікаў.

Сакратар партарганізацыі тав. Пугач расказаў на сходзе, як комуністы змагаліся за ўмацаванне калгаса. Партарганізацыя не раз займалася пытаннем развіцця і павышэння прадуктыўнасці жывёлагадоўлі. Стварэнне настаяннай жывёлагадоўчай брыгады і замацаванне кароў за даяркамі, праведзеныя па прапанове партарганізацыі, значна палепшылі догляд і ўтрыманне жывёлы. На аўпагадоўчую ферму партарганізацыя паслала члена партыі дэпутата Вярхоўнага Савета БССР Марыю Петруненка. Асабістым прыкладам яна змагла арганізаваць работнікаў фермы і дабілася добрых рэзультатаў.

Восенню ў калгасе трэба было пабудаваць скотны двор на 60 галоў. Гэту работу трэба было правесці ў самы кароткі тэрмін. І на сходзе пярвічнай партарганізацыі комуністы рашылі будаваць двор скарасным метадам. Калгаснікі горача падтрымалі гэту прапанову. Члены партыі тт. Мельнік, Грышаненка, Пугач пайшлі на будоўлю, дзе ўмела арганізавалі работу плотнікаў, кровельшчыкаў, шляроў. Двор быў пабудаван за два тыдні. Зараз такім-жа спосабам заканчваецца будаўніцтва другога двара.

У мінулым годзе калгас атрымаў ад жывёлагадоўлі 170 тысяч рублёў даходу. За год пагалоўе жывёлы ў калгасе павялічылася на 132 галавы. План укамплектавання ферм выканан поўнасцю.

Развіваць усе галіны гаспадаркі, выяўляць і скарыстоўваць рэзервы — такую задачу ставіла пярвічная партарганізацыя. Калгасны млын прыносіў нязначны даход з прычыны таго, што многа працілася на пакупку дроў. Партарганізацыя параіла праўленню перавесці млын на торф. За тры месяцы работы на торфе млын даў 13 тысяч рублёў даходу. Па прапанове партарганізацыі ў калгасе пабудавачы крупадзёрка і лесапілка, якія працуюць на энергіі, атрымліваемай ад калгаснай электрастанцыі.

У калгасе ёсць вялікі сад. У 1939 годзе ён даў 18 тысяч рублёў даходу. Комуністы рашылі, што гэта вельмі мала. Вывучыўшы становішча, яны выявілі, што значная частка плодаў раскрадалася. Праўленне прыняло меры. У мінулым годзе сад запава атарадзілі, устанавілі строгую ахову; у разультаце атрымана ад продажу фруктаў 117 тыс. руб. даходу.

Вялікую ўвагу партарганізацыя ўдзяляла пытанню ўмацавання працоўнай дысцыпліны. У мінулым годзе колькасць калгаснікаў, не выпрацаваўшых устаноўленага мінімума працадзён, зменшылася да 6 (а ў 1939 годзе іх было больш 200).

Партарганізацыя ўмела раз'ясняла калгаснікам гістарычныя пастановы партыі і ўрада аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў і аб асушны балот. Кожная брыгада, звяно, даярка, свінарка, кожны калгаснік ведаюць, за што яны будуць змагацца ў 1941 годзе і што атрымаюць за перавыкананне паказальнікаў.

Пасля вывучэння пастаноў падняласа зацікаўленасць калгаснікаў у рабоце. У брыгадах накоплена вялікая колькасць угнаенняў, якіх хопіць для ўсёй пасеўнай плошчы. У мінулым годзе торф клалі толькі пад бульбу, а цяпер загатовілі яго пад усе культуры. Калгас ва ўсеўзбраенні пачаў веснавую сяўбу.

Комуністы без зазнайства гаварылі аб поспехах, памятаючы, што дасягнутае— гэта толькі пачатак вялікай работы па забеспячэнню далейшага працвітання калгаса. Усе 7 комуністаў, выступаўшых у спрэчках па справаздачы, указвалі на сур'ёзныя прабелы. Тав. Мельнік справядліва папракнуў сакратара партарганізацыі ў тым, што ён вельмі мала займаўся выхаваннем маладых членаў і кандыдатаў партыі. У разультаце—у двух кандыдатаў ВКП(б) даўно пратэрміновая кандыдацкі стаж. Тав. Мельнік крытыкаваў кандыдата партыі тав. Памазнага за тое, што ён не служыць прыкладам для ўсіх калгаснікаў.

Вялікім прабелам у рабоце партарганізацыі з'яўляецца слабае вывучэнне комуністамі асноў марксізма-ленінізма. Тт. Карпенка, Кляпец, Шэйн усё яшчэ вывучаюць 1—2 раздзелы «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Комуністы тт. Петруненка, Грышаненка, Шэйн уносілі практычныя прапановы па далейшаму палепшанню работы пярвічнай партарганізацыі. Многія з гэтых прапаноў запісаны ў рашэнне схода па справаздачнаму дакладу.

Сход выбраў сакратаром пярвічнай партарганізацыі П. І. Гаўрыка, намеснікам — І. Ф. Пугача.

М. ПАЎЛЮЧЭНКАЎ.

Камарын.

ЧАМУ НЕ ПРАЦАВАЛА ПАРТБЮРО

Нельга сказаць, каб даклад сакратара партбюро тав. Нарэйкі на справаздачна-выбарным сходзе партарганізацыі мінскага паштамта быў кароткім. Наадварот, дакладчык гаварыў доўга, — паўтара ўклаўся ў рэгламент, прыводзіў намала лічбаў, статыстычных даных, якія сведчылі аб дрэннай рабоце пошты. Але ў дакладзе амаль нічога не было сказана аб тым, як партыйнае бюро і ўся партыйная арганізацыя змагаліся за паляпшанне работы прадпрыемства.

Мінская паштовая кантора, якая атрымлівае і адпраўляе штодзённа тысячы пісем, грашовых пераводаў і пасылак, працуе нездавальняюча. У мінулым годзе было падана 1238 скарг на дрэнную даставку карэспандэнцыі. Многія работнікі пошты яшчэ не ўсвоілі тэхнічных правіл паштовай эксплаатацыі. Нярэдкі выпадкі, калі карэспандэнцыя надоўга затрымліваецца ў сартыроўцы. У аддзеле сартыроўкі, дзе людзі павінны працаваць асабліва чотка і ўважліва, абстаноўка неспрыяючая: тут вельмі шумна і цесна. Часта пісьмы засылаюцца не па адрасу.

Яшчэ маюць месца раскрадання і страты каштоўных карэспандэнцый і пасылак. Вытворча-фінансавы план у першым квартале 1941 года выкананы на 98 проц.

З даклада можна было заключыць, што з працоўнай дысцыплінай таксама не ўсё добра. За час з 26 чэрвеня 1940 г. было 57 прагулаў і 63 спазненні.

У спрэчках выступіў член партыі тав. Міранові́ч. Ён гаварыў, што партыйнае бюро яшчэ не перабудавала сваю работу па-новаму, як гэта патрабуюць рашэнні XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Ва ўсіх аддзелах паштамта абстаноўка вельмі некультурная. Усюды, пачынаючы з уваходу, наведвальнік бачыць брудную падлогу, запыленыя сталы і крэслы. Некультурнасць вязе да расхлябанасці ў рабоце самога апарата.

— Сацыялістычнае спаборніцтва, — гаворыць тав. Міранові́ч, — у калектыве разгорнута вельмі слаба. Але гэта не перашкаджае адміністрацыі канторы незаслужана прэміраваць людзей. Робіцца гэта для «падняцця духу», як выразіўся былы кіраўнік канторы тав. Марголін. У страхавым аддзеле, напрыклад, прэміравана 8 работнікаў, а працуюць яны не так ужо добра.

Партыйнае бюро закінула работу з кандыдатамі партыі. Тут ёсць кандыдаты з 9-тадовым і 10-тадовым кандыдацкім стажам, як, напрыклад, тт. Барысевіч і Арціменьеў.

Заслугоўваюць асуджэння «метады» работы самога сакратара партбюро тав. Нарэйкі. Бюро фактычна не існавала. А адбылося гэта па наступнай прычыне. На мінулым справаздачна-выбарным сходзе (люты 1940 г.) партыйнае бюро было выбрана ў саставе 3 чалавек, у тым ліку членам бюро быў кіраўнік канторы тав. Марголін, які перайшоў на іншую работу, і ў саставе бюро асталося ўсяго 2 чалавекі. За 3 з палавінай месяцы гэтага года бюро заседала адзін толькі раз. Усе пытанні вырашаліся ў кабінеце дырэктара, з комуністамі вельмі мала раіліся.

Г. БЛЮМКІНА.

Аб чым гавораць цыфры і факты

(Партарганізацыя кіностудыі «Совецкая Беларусь»)

Мінская кіностудыя «Совецкая Беларусь» перажывае зараз складаны этап свайго існавання. Студыя знаходзіцца ў стане будаўніцтва і разам з тым яна павінна жыць творчым жыццём, выпускаць новыя поўнаметражныя мастацкія кінофільмы. Гэта выклікае неабходнасць прыбягаць да паслуг іншых кіностудый Саюза і, у прыватнасці, ленінградскай і кіеўскай. Работа партыйнай арганізацыі пры такіх умовах павінна быць асабліва чоткай, аператыўнай і баявой. У сваім справаздачным дакладзе сакратар партбюро тав. Змітровіч аб гэтых якасцях работы партыйнай арганізацыі не гаварыў і не мог гаварыць, бо пахваліцца тут, уласна кажучы, не было чым.

Тав. Змітровіч, між іншым, адзначыў, што сярод творчых работнікаў студыі пашырана шкодная «тэорыя»—нібы работа кінематаграфіі нямыслима без саліднага процанту браку.

Адсутнасць сапраўднай барацьбы з бракаробствам абышлася дзяржаве ў суму звыш 1,5 млн. рублёў.

З творчага плана на 1940 год у тры поўнаметражных мастацкіх фільмы (з частковым пераходам вытворчасці на 1941 год), адзін — «Людзі маленькага горада», гатовы больш чым напалавіну, быў спісан у брак, што прывяло да страты 1244 тыс. рублёў, другі —«Песня аб дружбе» — вельмі пасрэдны, і толькі «Жніво» рэжысёра Паўроцкага хутка паявіцца на экране.

Вялікі процант браку ёсць і па сцэнарыях. Напрыклад, сцэнарый «Параджэнне чалавека» прынёс страт на 106 тыс. рублёў. Пушчаны ў падрыхтоўчую работу сцэнарый «Стралковая рота» пасля зрасходавання 137 тысяч рублёў загадам Камітэта па справах кінофікацыі пры СНК СССР быў знят з вытворчасці.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што партыйная арганізацыя не ўваходзіла як след у пытанні вытворчасці, што творчае жыццё студыі знаходзілася па-за яе ўвагаю.

За справаздачны перыяд партбюро не раз слухала на сваіх пасяджэннях даклады дырэктара студыі тав. Іцкова. Аднак канкрэтныя пытанні творчага парадку, становішча са сцэнарыямі не знайшлі адлюстравання ў рабоце партбюро і агульных партыйных сходаў.

У сваіх выступленнях комуністы тт. Сокалава, Фаміных і іншыя адзначалі, што ў студыі прывыклі да вялікіх грашовых страт, што калі выяўляецца значны брак у той ці іншай рабоце, то аб ім толькі крыху пагавораць сям-там і імкнуцца хутчэй забыць. У студыі няма такога становішча, каб выпадак браку стаў прадметам сур'ёзнага абмеркавання ва ўсім калектыве, каб на аснове канкрэтнага факта гаварылі аб рабоце студыі ў цэлым, мабілізоўвалі ўвагу работнікаў на недапушчальнасць транжырвання дзяржаўных сродкаў, на недапушчальнасць работы па-старынцы, уразвалку.

Сакратар партбюро тав. Змітровіч, гаворачы аб выкананні плана на 1941 год, заявіў, што першы квартал паказаў значнае перавыкананне планавых заданняў (па дубляжу мастацкіх фільмаў — 200 процантаў). Але і тут справа абстаіць далёка не так ужо добра.

Тав. Гарэлік, які выступіў у спрэчках, гаварыў аб тым, што ні адзін з запланіраваных на 1941 год мастацкіх фільмаў яшчэ не пушчан у вытворчасць. Так, напрыклад, у другім квартале трэба было ўжо зазняць 300 карысных метраў плёнкі па фільму «Бура над Нзраччу», аднак яшчэ да гэтага часу не пачата нават падрыхтоўчая работа.

Далёка не бліскуча абстаяць справы і з працоўнай дысцыплінай. За 1940 год у студыі было 55 парушэнняў працоўнай дысцыпліны. У гэтым годзе ўжо мелі месца 4 прагулы і 3 спазненні. Прычым два спазненні былі зроблены комуністамі Ішынскім і Александравым.

Аб становішчы з дысцыплінай у студыі можна меркаваць па колькасці адміністратыўных спагнанняў. Як заявіў начальнік аддзела кадраў тав. Мусін, — амаль 50 проц. супрацоўнікаў студыі маюць розныя дысцыплінарныя спагнанні.

У спрэчках зусім не таварылася аб аўлаванні комуністамі тэорыяй марксізма-ленінізма. А гаварыць тут было аб чым. З 22 комуністаў (15 членаў і 7 кандыдатаў партыі) толькі 1 вывучае 6 раздзел «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», а астатнія не пайшлі далей чацвертага раздзела. За апошнія два месяцы партбюро не арганізавала ні адной гутаркі або лекцыі ў дапамогу вывучаючым гісторыю партыі.

Г. ТАРАН.

Глыбей уваходзіць у вытворчасць

Абгаворыўся справаздачна-выбарны сход партарганізацыі цагельнага завода № 3 (г. Мінск). Да 7 гадзін вечара ўсе комуністы былі ў зборы. Справаздачны даклад зрабіў сакратар партарганізацыі т. Лаўрэнчук.

Партарганізацыя завода складаецца з 6 членаў і 2 кандыдатаў партыі. План 1940 года заводам выкананы усяго на 92,8 процанта. Гэта сведчыць аб тым, што партарганізацыя недастаткова ўваходзіла ў вытворчасць, не ведала слабых старон работы завода.

Прастоі ў мінулым годзе склалі 1537 прэсатгадзін — 34,1 проц. усяго рабочага часу. Звыш 200 прэсатгадзін ідзе за кошт дрэннага рамонту абсталявання і звыш 250 — за адсутнасці дастатковай колькасці рабочай сілы. Ліквідацыя прастояў забяспечыла б не толькі выкананне, але і перавыкананне плана.

У 1941 годзе завод некалькі палепшыў сваю работу. План першага квартала выкананы на 105,7 проц., аднак па якасці прадукцыі прадпрыемства ўсё яшчэ адстае.

Пэўны пералом у рабоце завода атрыман таму, што партыйна-масавая работа значна палепшылася. Больш увагі аддаецца рабоце з профактывам, асабліва пасля XVIII партыйнай канферэнцыі.

Выступленні ў спрэчках насілі выключна дзелавы характар. Тав. Сіняковіч адзначыў, што завод яшчэ дрэнна падрыхтаван да сезона. У мінулым годзе адну змену ўкамплектавалі выключна з новазавербаваных, некваліфікаваных рабочых. У выніку на працягу раду месяцаў гэта змена не выконвала плана.

Майстар цэха тав. Корбут таксама спыніўся на вытворчых недахопах. Для завода неабходна набыць новыя ваганеткі і паскорыць рамонт старых, што будзе спрыяць выкананню вытворчага плана.

Дырэктар завода тав. Пуцінцаў расказаў сходу, што на заводзе ідзе ўстаноўка абсталявання для гарачага замесу гліны. Гэтым будзе ліквідавана адставанне завода па якасці прадукцыі. Трэба палепшыць кіраўніцтва стаханаўскім рухам і сацыялістычным спаборніцтвам, глыбей уваходзіць у эканоміку завода.

Выступаўшыя таварышы ўказалі на недастатковую ўвагу партарганізацыі да комсамольскай работы, недастатковае кіраўніцтва абаронна-масавай работай.

Сход прызнаў работу сакратара партарганізацыі здавальняючай. Сакратаром выбран тав. Лаўрэнчук, намеснікам сакратара — тав. Пуцінцаў.

Х. БЕКЕРМАН.

Гаспадарчы разлік у дэпо Жлобін-Паўночны

Паспяховае правядзенне ў жыццё народна-гаспадарчага плана 1941 года патрабуе няўхільнага павышэння прадукцыйнасці працы, зніжэння сабекошту, беражлівых адносін кожнага працоўнага да народнага дабра, эканоміі ва ўсім.

У сваім дакладзе на XVIII партыйнай канферэнцыі тав. Маленкоў заклікаў: «Неабходна, каб на нашых прамысловых прадпрыемствах і чыгуніках поўнасцю і ПРАВІЛЬНА СКАРЫСТОЎВАЛАСЯ АБСТАЛЯВАННЕ І ГАСПАДАРЧА РАСХОДВАЛІСЯ ІНСТРУМЕНТ, СЫРАВІНА, МАТЭРЫЯЛЫ, ПАЛІВА, ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЯ».

Работнікі дэпо Жлобін-Паўночны сёння дзеляцца вопытам, як яны, перайшоўшы на гаспадарчы разлік, дабіліся значнай эканоміі паліва, матэрыялаў, грошай і т. д.

Гэты вопыт дастойны пераймання ўсімі чыгункамі рэспублікі.

НА ШЛЯХУ ДА РЭНТАБЕЛЬНАСЦІ

У першым квартале мінулага года наша дэпо прынесла дзяржаве 223.690 рублёў страт. Перарасход дзяржаўных сродкаў быў выклікан прастоем паравозаў у рамонце, пізкай яго якасцю, вялікай колькасцю браку ў рабоце паравозных брыгад, перапалам паліва.

Каб забяспечыць ліквідацыю страт, мабілізаваць масы на эканомнае расходванне сродкаў, мы рашылі перавесці работу паравозных брыгад на гаспадарчы разлік. Гэта сустрэла гарачае адабрэнне паравознікаў.

Першымі на гаспадарчы разлік перайшлі паравозныя брыгады машыністаў тт. Паляшчука і Жаўнерука, іх прыкладу паследавалі і многія іншыя паравознікі. Паступова ўсе паравозныя брыгады былі пераведзены на гаспадарчы разлік.

Унядрэнне гаспадарчага разліку на паравозах і ў рамонтных цэхах дало магчымасць палепшыць стан паравознага парка. І калі ў першым квартале мінулага года дэпо перапаліла 712 тон 175 кілограмаў паліва, то ў наступныя месяцы яно мае эканомію паліва. За 8 месяцаў з 1 мая 1940 года па 1 студзеня 1941 года зэканомлена 1595 тон 395 кілограмаў паліва. Паравознікам выплачана за гэту эканомію 75.999 рублёў.

Машыністы тт. Паляшчук і Жаўнярук за 8 месяцаў мінулага года зэканомілі на рабочай сіле, матэрыялах і запасных частках 12.322 рублі. Вялікай эканоміі сродкаў на матэрыялах, запасных частках дабіўся таксама і рад іншых паравозных брыгад.

У гэтым годзе дэпо з месяца ў месяц працуе з прыбыткам, гаспадарчы разлік умацаваўся ў рамонтных цэхах і на лакаматывах. У лютым дасягнута эканомія матэрыялаў і запасных частак на 3116 рублёў, зэканомлена 31.303 кілограмы паліва, за што выплачана паравозным брыгадам 12.244 рублі. Машыністы тт. Шульгоў і Шарп з месяца ў месяц маюць эканомію сродкаў на матэрыялах, запасных частках, паліве. У лютым яны зберагілі на рамонце 578 руб., зэканомілі 36.600 кілограмаў паліва, за што атрымалі 1.932 рублі.

Унядрэнне гаспадарчага разліку, павышэнне адказнасці кожнага работніка за эканомнае расходаванне сродкаў дало магчымасць палепшыць усе асноўныя вымяральнікі работы дэпо, за што наш калектыў трымае пераходны чырвоны сцяг.

Рашэнні XVIII канферэнцыі ВКП(б) патрабуюць узмацнення ўвагі гаспадарнікаў і партыйных арганізацый да пытанняў эканомікі, беражлівага расходавання кожнай совецкай капейкі. Нам трэба яшчэ многае зрабіць, каб зусім пакончыць з безгаспадарчым расходаваннем сродкаў. У нас яшчэ маюць месца выпадкі паўторнага рамонту паравозаў, не ўсе паравознікі эканомяць паліва, некаторыя з іх дапускаюць брак, парушаюць графік руху паездоў.

Рэалізуючы рашэнні XVIII канферэнцыі ВКП(б), забяспечым рэнтабельную работу не толькі ўсяго дэпо, але і кожнага работніка.

І. ЗЕЛЕНКО,
начальнік дэпо Жлобін-Паўночны.

ДРУЖБА ПАРАВОЗНІКАЎ І РАМОНТНІКАЎ

З пераходам паравозных брыгад на гаспадарчы разлік павысіліся патрабаванні да рамонтных цэхаў. Паравозныя настойліва патрабавалі, каб эканомна расходаваліся матэрыялы і запасныя часткі, каб лакаматывы рамантаваліся быстра і высокаякасна. Гэта прымусіла і нас, рамонтнікаў, таксама перайсці на гаспадарчы разлік.

Перайшоўшы ў маі мінулага года на гаспадарчы разлік, разгарнулі спаборніцтва паміж паравознымі і комплекснымі брыгадамі на быстрае, высокаякаснае і эканомнае выкананне рамонту. Спаборніцтва, вытворчая дружба паравознікаў і рамонтнікаў далі нам магчымасць пераважную большасць лакаматываў выпускаць з рамонту за адну змену і нават некаторыя з іх за 5—6 гадзін.

У першым квартале мінулага года сярэдні прастой паравозаў у рамонце склаў 23 гадзіны пры норме 14 гадзін. Зараз сярэдні прастой складае 10,3 гадзіны, г. зн. ніжэй нормы.

У рамонтным цэху пяпер толькі асобныя рабочыя не выконваюць норм, а большасць выконвае нормы на 150—180 процантаў. У сакавіку ў рэзультаце гэтага выпусцілі з рамонту 16 паравозаў, кожны за адну змену.

Лунінскі метад, які падхапілі паравознікі нашага дэпо, намнога аблегчыў работу рамонтнага цэха. Многія паравозы не заходзяць у дэпо ад прамыўкі да прамыўкі. Пры пастаноўцы паравоза на прамыўку машыністы запісваюць мала пунктаў рамонту, частку работ выконваюць сваімі сіламі. Рамонтны цэх зараз з месяца ў месяц мае эканомію на рабочай сіле. У студзені зэканомілі 4425 рублёў, у лютым—6873 руб. Але гэта эканомія на рабочай сіле пагашаецца перарасходам сродкаў на матэрыялах. У студзені на матэрыялах перарасходавалі 1870 рублёў, у лютым—2096 рублёў.

У чым прычына гэтага?

Перш за ўсё, у тым, што мы не ўжылі яшчэ факты паўторнага рамонту. Паўторны рамонт выклікае лішні расход матэрыялаў, нарушае нармальную работу цэха і паравознага парка.

Адчувальна сказваецца на нашай рабоце брак, які дапускаюць паравознікі. У апошнія месяцы пачасціліся выпадкі выплаўлення падшыпнікаў. Міжпаязны рамонт таксама напосіць вялікія страты, дэзарганізуе ўсю работу дэпо.

Гэтыя недахопы пастараемся хутка ліквідаваць і даб'емся новых поспехаў у гаспадарчым разліку, зберажом нашай радзіме яшчэ сотні і тысячы рублёў.

М. КІЗЕЕЎ,
майстар цэха прамыўкі.

Павысілася цікавасць да пытанняў эканомікі

Машыністы, брыгадзіры, майстры, слесары і памочнікі машыністаў—зараз частыя госці бухгалтэрыі. Яны цікавяцца, ці не перавыдаткоўваюцца матэрыялы, змазачны, асвятляльны і абцірачны матэрыял, запасныя часткі.

Першы час баяліся, што не ўдасца забяспечыць чоткі, аператыўны ўлік работы гаспадарча-разліковых брыгад, некаторыя выказвалі думку, што прыдзецца павялічыць штат канторскіх работнікаў. Але нічога гэтага не патрэбавалася. Пры тым-жа штаце забяспечваем без затрымак улік работы гаспадарча-разліковых брыгад, можам у любы час даць цікавячыя іх даныя. На кожны гаспадарча-разліковы паравоз у нас заведзен ліцавы рахунак. Атрымлівае, напрыклад, брыгада ў паездку абцірачны і змазачны матэрыял, выпісвае дэталі для рамонту, адразу гэтыя даныя заносім у ліцавы рахунак. У канцы месяца нам астаецца толькі падвесці вынікі, і месячныя даныя работы на гаспадарчым разліку вядомы.

Сярод рахунковых работнікаў нашага дэпо шырока разгарнулася спаборніцтва за быстры і чоткі ўлік работы брыгад. Зайшоўшы ў кантору, машыніст, брыгадзір не толькі атрымлівае цікавячыя яго даныя,—рахунковыя работнікі лічаць сваім абавязкам дапамагчы ім разабрацца ў лічбах, падказваюць, на што трэба звярнуць увагу, каб дабіцца большай эканоміі або ліквідаваць перарасход па таму ці іншаму артыкулу.

Тое, што калектыў дэпо дабіўся значнай эканоміі сродкаў, гэта бясспрэчна, але ёсць яшчэ нямала рэзерваў для павелічэння даходнасці, для яшчэ большай эканоміі.

У нас у дэпо не зжыт яшчэ міжпаязны рамонт. Як вядома, на міжпаязны рамонт не адпускаецца ні капейкі. І гэта зразумела. Але з месяца ў месяц расходуем на гэту справу тысячы. За студзень і люты выцаткавана 3183 руб. Міжпаязны рамонт выклікаецца дрэнным доглядам некаторых машыністаў за лакаматывамі і нізкай якасцю рамонту. На гэта небяспечна звярнуць самую сур'ёзную ўвагу, бо міжпаязны рамонт не толькі выклікае перарасход сродкаў, але і парушае графік работы паравозаў і рамонтных цэхаў.

У дэпо яшчэ не зжыта антыдзяржаўная практыка, калі з паравозаў перад адпраўленнем іх у заводскі рамонт знімаюць усе адказныя дэталі. А потым за іх устаноўку прыходзіцца плаціць заводу вялікія грошы. За першы квартал 1941 года за гэта заплочана 5848 рублёў.

П. ШУМСКІ,
гапоўны бухгалтар.

Па метаду Луніна

Хутка год, як наш паравоз працуе на гаспадарчым разліку. З пераходам на гаспадарчы разлік мы навучыліся весці лік не толькі тонам вугалю, кілограмам змазачнага матэрыялу, але і рублям і капейкам. Выпісваючы для чарговай паездкі змазку, абцірачны і асвятляльны матэрыял, мы тут-жа цікавіліся, у якую суму нам гэта абыйдзецца.

— Дарагавата,—нярэдка гаварылі мы, — прыдзецца больш эканомна расходаваць змазку.

Такая-ж карціна атрымліваецца пры пастаноўцы паравоза на рамонт. Раней мы і паняцця не мелі, колькі расходуецца матэрыялу на рамонт, ва што абыходзіцца рабочая сіла. А зараз, з пераходам на гаспадарчы разлік, зусім іншая справа. Машыніст абавязан падпісваць патрабаванне на неабходныя для рамонту матэрыялы і запасныя часткі. Без яго подпісу матэрыялаў не адпусцяць. І вось, раней чым падпісваць гэтае патрабаванне, мы прыкідваем, а колькі гэта каштуе, абмяркоўваем усёй брыгадай, а ці нельга патаніць рамонт, каб больш грошай лічылася на нашым ліцавым рахунку.

Вялікую ролю ў гэтай справе адыграў метад Луніна. Выконваючы сваімі сіламі ўвесь дробны рамонт, пры пастаноўцы паравоза на прамыўку запісваем не больш 8—12 пунктаў. У канцы сакавіка наш паравоз стаяў на чарговай прамыўцы. Запісалі ўсяго 15 пунктаў, прытым пяць работ выканалі сваімі сіламі. Самі адрэгуліравалі тормаз, справілі пясочніцу, адрамантавалі сіфон і параазбільготнік.

Наш паравоз заўсёды ў спраўным і культурным стане. Ён заўсёды гатоў вадзіць поезды цяжкой вагі з высокай скорасцю.

Якія-ж вынікі пераходу на гаспадарчы разлік?

За восем месяцаў мінулага года па матэрыялах і рабочай сіле зэканомілі 4.709 рублёў, зберагілі 148 тон паліва. За гэта нам выплачана 7.582 рублі. У студзені зберагілі 30 тон паліва, зэканомілі на рамонце лакаматыва 490 рублёў.

У социялістычным спаборніцтве імені XVIII партыйнай канферэнцыі наш паравоз заваяваў пераходны чырвоны сцяг Беларускай чыгункі. Яшчэ больш умацоўваючы гаспадарчы разлік, шырэй прымяняючы метад Луніна, даб'емся яшчэ большых поспехаў у рабоце.

В. ПАЛЯШЧУК,
машыніст паравоза № 5552.

Пры гаспадарчым разліку павялічваецца і заработак

У лістападзе мінулага года мы даведаліся аб выдатным пачыне машыніста дэпо Новасібірск тав. Луніна, узняўшага сцяг барацьбы за скарачэнне аб'ёму рамонту.

Разам са сваім напарнікам машыністам тав. Шарпом я ўключыўся ў лунінскі рух. Пасля кожнай паездкі мы стараемся сустрэцца, каб даведацца аб стане лакаматыва, аб тым, як вяла сябе машына ў дарозе. Дагаварваемся аб тым, які рамонт можна выканаць сваімі сіламі.

Пастаянныя клопаты аб спраўным і культурным стане паравоза даюць нам магчымасць павялічваць прабег паміж прамыўкамі, вадзіць сістэматычна з крываносаўскай скорасцю поезды цяжкой вагі, эканоміць паліва. Наш паравоз не затрымліваецца падоўгу на прамыўках. Частку рамонту мы выконваем сваімі сіламі, чым дапамагаем комплекснай брыгадзе выпусціць наш паравоз з рамонту за адну змену пры норме 14 гадзін. Працуючы на гаспадарчым разліку, па-лунінску, мы не толькі эканомім дзяржаве вялікія сродкі, але і павышаем свой заработак.

У мінулым годзе за 8 месяцаў мы зэканомілі на матэрыялах і рабочай сіле 2.822 рублі, зберагілі 17 тон паліва, за што атрымалі 938 рублёў. Яшчэ лепшых рэзультатаў мы дабіліся ў гэтым годзе. У студзені мы зберагілі на матэрыялах і рабочай сіле 625 руб., зэканомілі 37 тон паліва, за што атрымалі 1.800 рублёў, у лютым на матэрыялах і рабочай сіле зберагілі 57 рублёў, зэканомілі 36.600 кілограмаў паліва, атрымалі за гэта 1932 рублі.

У сакавіку я зарабіў 1.626 рублёў. З чаго складаецца гэты заработак? За эканомію паліва я атрымаў 458 рублёў, за ваджэнне поездаў цяжкай вагі — 85 рублёў, за выслугу год — 126 рублёў, за класнасць — 30 рублёў, за перавыкананне кілометравага прабегу — 927 рублёў.

Такія высокія заработкі маюць многія паравознікі нашага дэпо. Гаспадарчы разлік прымусіў паравозніка стаць сапраўдным гаспадаром даверанага яму лакаматыва, клапаціцца аб яго стане, аб беражным расходаванні сродкаў, матэрыялаў і вугалю.

І. ШУЛЬГОЎ,
машыніст паравоза № 720-94.



Папавінец — лепшы машыніст Заходняй чыгункі А. Кунашкевіч (справа) перад адпраўленнем у чарговую паездку гутарыць з начальнікам Мінскага паравознага дэпо Ф. Кузняцовым. Фото І. Шышко. (БЕЛТА).

УСЕБАКОВА РАЗВІВАЦЬ ГРАМАДСКУЮ КАЛГАСНУЮ ВЫТВОРЧАСЦЬ



Ведаць эканоміку свайго калгаса, дабіваецца максімальнага скарыстання наяўных рэзерваў —такую задачу ставяць сабе калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Дзержынскага. Мярылам, паказваючым моц калгаса, яго ўсебаковае развіццё, з'яўляецца атрыманая прадукцыя на 1 гектар зямельнай плошчы.

У калгасе падлічылі, што з зямельнай плошчы (1815,87 гектара), з якой налічаюцца абавязковыя дзяржаўныя паставкі прадукцыі жывёлагадоўлі, у 1940 годзе атрымана на адзін гектар:

— Малака **105** літраў.

— Мяса (здаванага і праданага дзяржаве і рэалізаванага на рынку) **20** кілограмаў.

— Скурсыравіны ўсіх відаў было здана і прадана дзяржаве 172 штукі, у тым ліку скур буйнай рагатай жывёлы 118 штук. На 1 гектар прыпадае **0,1** штукі.

— Воўны—**130** грамаў.

— На кожны гектар пахаці (854,78 гектара) у калгасе атрымана **53** яйкі.

***

У мінулым годзе з конефермы калгас прадаў іншым сельгасарцелям **8** племянных вытворнікаў; у фонд Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі здана **10** артылерыйскіх коней.

***

Калгас яшчэ адстае па ўраджайнасці зернавых культур. За тры апошнія гады ўраджайнасць зернавых з плошчы ў 459 гектараў тут склала ў сярэднім толькі па **10,28** цэнтнера з гектара.

Сярэдні ўраджай бульбы за мінулы год з плошчы ў 125 гектараў склаў **183** цэнтнеры з кожнага.

Гародніны з плошчы ў 6 гектараў — **252** цэнтнеры з кожнага.

Кармавых коранаплодаў з плошчы ў 17 гектараў—**305** цэнтнераў з кожнага.

Сена натуральных сенажацей з плошчы ў 695 гектараў—**11,5** цэнтнера з кожнага.

Сена канюшыны з плошчы ў 100 гектараў—**32,7** цэнтнера з кожнага.

***

Грашовы даход за 1940 год па калгасу склаў 447 597 рублёў, у тым ліку:

— ад конегадоўлі—62.805 рублёў;

— ад гародніны—132.560 рублёў;

— ад малочна-таварнай фермы — 105.804 рублі;

— ад птушкі — 35.000 рублёў.

Усяго ад жывёлагадоўлі было атрымана даходу 214.429 рублёў.

РАССАДНІК ПЛЕМЯННОЙ КОНЕГАДОЎЛІ

Племянная конегадоўчая ферма нашага калгаса карыстаецца заслужанай славай. Яна вось ужо трэці год будзе ўдзельнічаць на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Арганізаваная ў 1930 годзе ферма дала краіне дзесяткі пародзістых конематак і вытворнікаў. Толькі за апошнія 4 годы мы здалі дзяржаве і прадалі калгасам 49 галоў племяннога маладняка пароды «брабансон».

Наша ферма з'яўляецца сапраўдным рассаднікам племянной конегадоўлі ў раёне. Яна аказвае вялікі ўплыў на паляпшэнне пароды коней у навакольных калгасах. Амаль ва ўсіх калгасах Слуцкага раёна цяпер ёсць племянныя вытворнікі нашай гадоўлі. Яны ёсць таксама ў Грэскім, Копыльскім і Мінскім раёнах. Коні—краса і гордасць нашага калгаса.

На калгаснай племянной конегадоўчай ферме зараз ёсць 39 галоў брабансонскай пароды, у тым ліку 20 конематак і 4 вытворнікі. Вытворнік «Гамбіт» з нашай фермы атрымаў на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы атэстат трэцяй ступені. Усяго ў нашым калгасе налічваецца 300 коней. Іх даглядае 25 конюхаў.

Нашы поспехі ў развіцці конегадоўлі ў значнай ступені абумоўлены тым, што на ферме навезен большавіцкі парадак. Усе коні замацаваны за асобнымі конюхамі. На канюшні ўстаноўлен цвёрды распарадак дня. Рабочы дзень конюха пачынаецца ў чатыры гадзіны раніцы. У гэты час праводзіцца паенне коней і раздача аўса. У 5 гадзін 30 мінут раздаецца сена, да 7 гадзін праводзіцца чыстка коней. У 7 гадзін 30 мінут коні выводзяцца на работу. З 13 да 14 гадзін 30 мінут — абедзенны перапынак. У гэты час раздаецца корм і праводзіцца водапой. З 20 гадзін вечара конюхі прымаюць коней, прышоўшых з работы, і раздаюць сена. У 21 гадзіну — водапой. З 22 гадзін раздаецца сена на ноч.

Апрача існуючага цвёрдага распарадку дня, на кожнага каня ў нас устаноўлен поўны рацыён кармоў. У часе ажаробу на ферме круглосутачна дзяжурыць конюхі.

На ферме выраслі выдатныя кадры конюхаў, любячых сваю справу. Гэта тт. Сяргей Крываль, Кузьма Шарамет, Нікалай Крот і Аляксандр Сакавіч. Старшы конюх Сяргей Ефімавіч Крываль за апошнія годы поўнасцю захаваў і выгадаваў маладняк у колькасці 61 галавы.

У калгасе праведзена значная работа па метызацыі ўсяго конскага пагалоўя. Цяпер мы ставім перад сабой задачу ў самы кароткі тэрмін перавесці ўсё конскае пагалоўе на чыстанародных брабансонаў.

В. І. ГУК,
загадчык племянной конегадоўчай фермы, удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Куды пойдуць сродкі капіталаўкладанняў

З года ў год на сродкі капіталаўкладанняў калгас будуе новыя будынкі, набывае машыны, племянную жывёлу. За 1940 год фонд капіталаўкладанняў па калгасу склаў 117.750 рублёў. На 1 студзеня 1941 года на рахунку капіталаўкладанняў знаходзілася 74.521 рубель.

У гэтым годзе калгас набыў ужо 11 галоў племянной галандскай буйнай рагатай жывёлы. На гэта выдаткавана 18 тысяч рублёў. На сродкі капіталаўкладанняў тут будзе закончана будаўніцтва лазні, будуць пабудаваны дзіцячыя яслі, канюшня на 40 галоў, стальмашня, артэзіянскі калодзеж коштам у 30 тысяч рублёў. Частка сродкаў пойдзе на пасадку грамадскага саду.

Прайшоў год, як ЦК ВКП(б) і СНК СССР прынялі рашэнне аб змяненні ў палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў. Гэта рашэнне партыі і ўрада з'явілася магутным стымулам для ўсебаковага развіцця грамадскай калгаснай вытворчасці.

Грамадская зямля—крыніца сілы і магутнасці калгаснага ладу, росквіту арцельнай гаспадаркі, росту заможнага і культурнага жыцця калгаснікаў.

Ніжэй мы друкуем матэрыялы аб калгасе імені Дзержынскага, Слуцкага раёна, у якіх расказваецца, як калгаснікі рацыянальна скарыстоўваюць кожны гектар грамадскай зямлі і ўсебакова развіваюць сваю арцельную гаспадарку.

ЗРОБІМ ДАХОДНЫМ КОЖНЫ ГЕКТАР ЗЯМЛІ

Увядзеннем пагектарнага налічэння абавязковых паставак сельскагаспадарчых прадуктаў партыя і ўрад паставілі перад намі задачу ўсебакова развіваць арцельную гаспадарку. Наш калгас імені Дзержынскага—адзін з буйнейшых у Слуцкім раёне. На плошчы ў 2223 гектары раскінулася наша зямля, замацаваная совецкай дзяржавай за калгасам на вечнае карыстанне.

Узяць ад зямлі ўсё, што яна можа даць, атрымаць з кожнага гектара большую колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі — вось чаго патрабуюць ад нас партыя і совецкі ўрад. У гэтым цесна пераплятаюцца інтарэсы нашай дзяржавы, калгасаў і кожнага калгасніка. Да гэтага накіраваны ўсе нашы імкненні.

Наш калгас мае добра развітую жывёлагадоўлю. У калгасе створаны і поўнасцю ўкамплектаваны 5 жывёлагадоўчых ферм: малочна-таварная, племянная конегадоўчая, аўцагадоўчая, свінагадоўчая і птушкагадоўчая. У нас ёсць таксама пасека, у якой налічваецца 46 пчоласем'яў. На малочна-таварнай ферме ёсць 356 галоў, аўцагадоўчай — 146, свінагадоўчай — 42, птушкагадоўчай — 716 і племянной конегадоўчай ферме — 39 галоў. Усяго ў калгасе ёсць 300 коней.

Раней ніколі не падлічвалі, што дае калгасу адзін гектар зямлі. Цяпер падлічылі і бачым, што яшчэ некалькі алстаём ад перадавых калгасаў па атрыманню сельскагаспадарчай прадукцыі ў пераводзе на адзін гектар зямельных угоддзяў. У нас ёсць усе ўмовы і магчымасці ўсебакова развіваць арцельную гаспадарку, але мы далёка яшчэ іх не выкарысталі. Даволі сказаць, што ў такім буйным калгасе, як наш, да апошняга часу не быў уведзен правільны севазабарот. Адсутнасць севазабароту не матлі задавальнічаць высокім ураджаям, прымяненню перадавой агратэхнікі. За апошнія тры годы сярэдняя ўраджайнасць зернавых па калгасу склала ўсяго 10,28 цэнтнера з кожнага гектара.

Пастанова партыі і ўрада аб змяненні ў палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў адкрыла выдатныя перспектывы для развіцця грамадскай калгаснай вытворчасці. Закончана арганізацыя і ўкамплектаванне жывёлагадоўчых ферм, але прадстаіць яшчэ многа чаго зрабіць па далейшаму павышэнню прадуктыўнасці жывёлагадоўлі і ўраджайнасці калгасных палёў.

За апошнія гады праведзена значная работа па паляпшэнню пароднасці жывёлы. Вялікія мерапрыемствы намечаны па стварэнню моцнай кармавой базы, без чаго немагчыма далей павышаць прадуктыўнасць жывёлагадоўлі. Рыхтуемся падсеяць 108 гектараў канюшыны, пасеяць 25 гектараў віка-аўсянай сумесі на сена, правесці паляпшэнне сенажаці шляхам залужэння. Намячаем таксама ў гэтым годзе палепшыць нашы пасбішчы, выкарыстоўваць іх выключна загонным спосабам.

Зараз калгас напярэдадні выхаду ў поле. Да веснавой сяўбы ў нас поўнасцю падрыхтавана насенне, інвентар і збруя. Натхнёныя рашэннямі партыі і ўрада аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі і аб асушцы беларускіх балот, нашы калгаснікі ўзялі на сябе абавязацельства заваяваць сёлета 100-пудовы ўраджай зернавых, 200 цэнтнераў бульбы і 5,5 цэнтнера ільновалакна з гектара.

Чым мы гарантуруем выкананне сваіх абавязацельстваў? Па-першае, у нас усё поле пад пасеў яравых—423 гектары—зазяблена восенню; па-другое, пад яравыя вывезлі на поле 4.350 тон гною, 550 тон торфу, сабралі 6 тон курынага памёту, 4,5 тоны попелу, завезлі ў калгас 55 тон мінеральных угнаенняў. Сёлета будзем прымяняць у больш шырокіх маштабах дасягненні перадавой навукі і багаты вопыт перадавікоў сельскай гаспадаркі—удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Намячаем правесці яравізацыю зернавых культур і перакрыжаваны пасеў. На плошчы ў 240 гектараў пасеву азімых праводзім падкормку і баранаванне.

Асаблівую ўвагу звяртаем на асваенне новых тэхнічных культур — кок-сагыза і цукровых буракоў. Гэтыя культуры ў нас сёлета будуць сеяцца ўпершыню. Пад кок-сагызам будзе занята 10 гектараў і пад цукровымі буракамі 11 гектараў. Для догляду за ільном, кок-сагызам, цукровымі буракамі і гародніннымі культурамі мы стварылі 17 пастаянных звеньняў.

Вялікая работа будзе праводзіцца сёлета па асушэнню і асваенню 300 гектараў балот, якія ёсць у калгасе.

Скарыстоўваючы ўсе ўнутраныя рэзервы калгаса, зробім даходным кожны гектар грамадскай зямлі, шырэй разаўём усе галіны грамадскай вытворчасці.

С. Л. МАХЛАЙ,
старшыня калгаса імені Дзержынскага, Слуцкага раёна.

КАЛГАСНАЯ ПТУШКАФЕРМА

Птушкагадоўля — даходная галіна грамадскай калгаснай вытворчасці. У гэтым добра пераканаліся нашы калгаснікі.

Наша птушкагадоўчая ферма існуе ўжо 10 год. Яна прыносіць калгасу вялікія даходы. Напрыклад, за адзін толькі мінулы год атрымалі ад рэалізацыі прадукцыі птушкафермы 33.950 рублёў. На калгаснай птушкагадоўчай ферме зараз налічваецца 716 курэй пароды «белы легорн». Адных толькі нясушак у нас ёсць 635 штук. За мінулы год атрымалі на ферме 45.200 яек. Кожная нясушка дала ў сярэднім па 135 яек. Другі год наша ферма будзе ўдзельнічаць на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Праўленне нашага калгаса аддае вялікую ўвагу развіццю птушкагадоўлі. Для размяшчэння фермы ў нас пабудаваны тыпавы птушнік на 1000 галоў, памяшканне для варкі і прыгатавання кармоў, склеп для хавання бульбы і коранаплодаў і калодзеж. Увесь выгул для птушкі абнесен дротавай сеткай. Ферма поўнасцю забяспечана ўсім неабходным інвентаром.

Наша птушкаферма не толькі прыгожа знешнім выглядам, яна па свайму ўстройству вельмі зручна. Загатоўка кармоў, кармленне птушкі, уборка птушніка, удаленне нясушак з кантрольных гнёздаў праводзіцца па ферме ў дакладна вызначаны час.

Птушка ў нас корміцца па рацыёну. Устаноўлен рознастайны асартымент кармоў, у саставу якіх уваходзіць: ячмень другога сорту, пшанічныя адыходы ад сартыроўкі, пшанічныя вотрубі, ячменная і аўсяная мука, бульба, рыбная мука, дробна рэзаная канюшына, сенная труха, морква, кармовыя буракі, дроблены мел, адпашаная вапна, драўляны вугаль і гравій. На практыцы пераканаліся, што чым рознастайней рацыён па свайму саставу, тым лепш паядае яго птушка і тым хутчэй дасягаецца высокая прадуктыўнасць яе.

За апошнія годы накапілі багаты вопыт па вырошчванню маладняка—куранят. У 1940 годзе з атрыманых на інкубатарнай птушкагадоўчай станцыі 1600 куранят вырасцілі і захавалі 1553—97,1 проц. Пры вырошчванні куранят стараемся падтрымліваць адпаведную тэмпературу памяшкання. Яна мяняецца ў нас у залежнасці ад узросту куранят. Напрыклад, пры ўзросце куранят ад 1 да 5 дзён тэмпература памяшкання ўстаноўлена ў 32 градусы па Цэльсію, ад 6 да 10 дзён — 30 градусаў, ад 11 да 20 дзён — 28 градусаў, ад 21 да 30 дзён—26 градусаў і ад 31 да 40 дзён — 24 градусы.

Кармленне праводзіцца ў строга вызначаны час. Першыя 15 дзён куранаты кормяцца праз дзве гадзіны, а пасля паступова — праз 3—4 гадзіны. У рацыён уводзім наступныя кармы: дробнасечаныя ячменныя і пшанічныя крупы, пшанічныя вотрубі, знятае малако, адзін процант рыбнай мукі да агульнага рацыёна.

Пастанова Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі выклікала вялікі творчы ўздым на птушкагадоўчай ферме. Сярод птушніц разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за атрыманне высокай яйканоскасці курэй. Змагаемся за атрыманне ў гэтым годзе ад кожнай нясушкі па 140 яек. За тры месяцы гэтага года ферма атрымала ўжо 11 тысяч яек. У лік абавязковых паставак дзяржаве наш калгас здаў 2.570 яек. Больш 2000 яек здалі на інкубатарную станцыю. Усяго здадзім сёлета на інкубатарную станцыю, згодна заключанага дагавора, 20 тысяч племянных яек.

Ператварыць птушкагадоўлю ў перадавую галіну калгаснай грамадскай вытворчасці — над гэтай задачай працуе зараз увесь калектыў нашай фермы.

Н. Л. ГУРЫНОВІЧ,
загадчык племянной птушкагадоўчай фермы, удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.



Усебаковае развіццё калгаснай грамадскай гаспадаркі немагчыма без добра развітай жывёлагадоўлі.

Гэта добра разумеюць калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Дзержынскага. Яны ўдзяляюць выключную ўвагу развіццю грамадскай жывёлагадоўлі. **На кожныя 100 гектараў** пахаці, сенажаці і пасбішчаў цяпер у калгасе прыходзіцца:

20 галоў буйнай рагатай жывёлы,
— **17** коней,
— **8** авечак,
— **3** свінні,
— **40** курэй,
— **3** пчоласям'і.

У калгасе недастаткова яшчэ развіта свінагадоўля. Зараз праўленне арцелі прымае ўсе меры, каб зрабіць свінагадоўлю высокаразвітай і даходнай.

ВЫСОКІЯ ДАХОДЫ АД АГАРОДНІЦТВА

Агародніцтва — новая галіна нашай калгаснай гаспадаркі. Ім мы пачалі займацца толькі ў апошнія гады. У мінулым годзе пад агародам у нас было занята 6 гектараў. З кожнага гектара атрымалі па 243 цэнтнеры ранняй капусты, па 111 цэнтнераў памідораў.

Развіццё агародніцтва ў нас мае вялікія перспектывы. Гэта вельмі даходная галіна калгаснай вытворчасці. У 1940 годзе ад агародніцтва калгас атрымаў 132.560 рублёў даходу.

Сёлета пад гародніной будзе занята 8,7 гектара. Калгас мае 150 парніковых рам. У парніках зараз вырошчваем расаду памідораў, ранняй капусты і цыбулі.

Для догляду за агароднымі культурамі ў калгасе створана пастаяннае звяно з 10 чалавек. Сёлета змагаемся за атрыманне з кожнага гектара па 300 цэнтнераў памідораў, 250 цэнтнераў агуркоў і высокі ўраджай іншых культур. Агародніцтва ў гэтым годзе павінна прынесці калгасу даход у суме 145 тысяч рублёў.

Ц. А. БАРЦЭВІЧ,
звеньнявы агароднага звяна.

Загадчык МТФ Дзмітрый Кашавар, даярка Каця Бурак, загадчык птушкафермы Наум Гурыновіч і старшыня калгаса Сцяпан Махлай.

Калгасная конеферма карыстаецца заслужанай славай ва ўсёй рэспубліцы. Вялікая работа праведзена ёю па пароднаму паляпшэнню конскага пагалоўя ў многіх і многіх калгасах Слуцкага, Грэскага і іншых раёнаў. За добрыя паказальнікі па вырошчванню коней, за амаль 100-процантны ажароб конематак конеферма два годы з'яўлялася ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У гэтым годзе ферма зацверджана для шырокага паказу на выстаўцы.

Зараз на конеферме наступіў адказны перыяд — ідзе ажароб і злучка. Тры конематкі з 16 ужо ажарабіліся. У любы час сутак тут можна сустрэць дзяжурнага конюха. Дакладнае выкананне распарадку дня, правільны кармавы рацыён, уважлівы догляд, асабліва за жаробнымі конематкамі —усё гэта зрабіла конегадоўлю ў калгасе высокадаходнай галіной гаспадаркі.

ЖЫВЫ КАНВЕЙЕР

Падыходзім да адной са шматлікіх гаспадарчых пабудоў калгаса. Яшчэ здалёк чуваць разнагалосы петушыны хор.

— Наша птушкаферма, — аб'ясняе старшыня, — больш 700 курэй мае. — Ён стучыць у дзверы фермы, на якіх напісана: «Уваход пабочным асобам сурова забаронен». Дзверы адчыняе загадчык птушкафермы Наум Гурыновіч.

— Здароў, Наум! У пябе тут весела...

— Сумаваць не прыходзіцца. З раніцы і да вечара бесперапынна паступаюць яйкі, паспявай толькі збіраць іх. Сапраўдны жывы канвеер!

Прасторны, светлы будынак фермы з мноствам курэй пароды «белы легорн». Двор, абгароджаны металічнай сеткай і абсаджаны маладымі дрэўцамі, дапаможныя пабудовы на дварэ ствараюць прыемнае ўражанне. Птушкаферма прыносіць калгасу вялікія прыбыткі. У мінулым годзе, напрыклад, на адну нясушку тут было атрымана па 135 яек, даход ад фермы склаў каля 35 тысяч рублёў.

З двух аддзяленняў фермы птушніцы Таня Барцэвіч і Агафія Ерасуцкая раз-заразам выносяць яйкі. На кожным з іх яны ставяць алоўкам нумар той нясушкі, ад якой атрымана яйка, і кладуць іх у скрыню. Тут-жа стаіць ужо некалькі запячатаных скрынь з яйкамі.

— Апошнюю партыю яек падрыхтавалі ў лік дзяржаўных паставак, — гаворыць загадчык.—Потым яйкі пойдуць на інкубатарную станцыю, дагавор з ёю заключылі.

Над сталом загадчыка вісіць таблічка. Яна зроблена так, што відаць, у які дзень колькі яек было атрымана на птушкаферме. 27 сакавіка значыцца, напрыклад, — 333, першага красавіка — 301 і т. д. Кожны дзень у табліцы паяўляецца новая такая лічба. У канцы месяца падводзіцца вынік. Адначасова з агульным улікам па ферме ідзе ўлік колькасці яек, знесеных кожнай нясушкай. Гэта дазваляе дакладна ўстанаўліваць яйканоскасць курэй і адбіраць з іх высокапродуктыўных.

ГАЛАНДКІ

Два новыя прасторныя кароўнікі, цялятнік і падсобныя будынкі знаходзяцца на водшыбе ад іншых пабудоў калгаса. У спалучанні яны ўтвараюць жывёлагадоўчы гарадок, дзе зараз налічваецца 356 галоў буйнай рагатай жывёлы. З года ў год ідзе паляпшэнне стада шляхам метызацыі вытворнікамі галандскай пароды. Пярэстыя галандкі паступова выцясняюць з малочна-таварнай фермы беспародных, малапрадуктыўных кароў. Ідучы па гэтаму шляху, калгас ужо ў гэтым годзе на сродкі капіталаўкладанняў набыў 11 галоў чыстакроўнай галандскай жывёлы.

За мінулы год даход ад МТФ склаў 105.804 рублі. На кожную фуражную карову (усяго 140 кароў) было надоена па 1.362 літры малака.

— Гэта вельмі мала, — кажа загадчык малочна-таварнай і аўцагадоўчай ферм Дзмітрый Кашавар. — Хоць-бы мы дабіліся такіх рэзультатаў, якіх дабілася наша лепшая даярка Каця Бурак. Надой на адну карову па яе групе склаў 1.713 літраў.

У гэтым годзе на ферме будзе 153 дойных каровы — па 13 галоў больш устаноўленага плана. 100 кароў ужо ацялілася. Работнікі фермы зараз прыкладаюць максімум стараннаў, каб поўнасцю захаваць маладняк і намнога перавыканаць устаноўлены план надою малака, сутачнай прыбаўкі ў вазе цялят. Кожны з іх добра разумее, што чым лепшых рэзультатаў ён дасягне, тым больш атрымае прадуктаў жывёлагадоўлі ў выглядзе дадатковай аплаты. На ферме ўстаноўлен узорны парадак, заведзен дакладны ўлік.

— Стада ў нас укамплектавана,—гаворыць тав. Кашавар. — Цяпер мы павінны змагацца за рэзкае павышэнне яго прадуктыўнасці. І мы гэтага абавязкова дасягнем.

***

Вечарам на кватэру да старшыні калгаса зайшоў загадчык хаты-лабараторыі Арцём Махлай.

— Што сёння рабіў, Арцём? — прывітаўшыся, запытаў старшыня.

— Пад кок-сагыз мінеральнае ўгнаенне прывёз.

У гэтым годзе ў калгасе ўпершыню будзе засеяна 10 гектараў кок-сагыза. Уводзіцца і другая тэхнічная культура — цукровыя буракі. Новыя тэхнічныя культуры паступова заваёўваюць месца на палях калгаса. У гэтым вялікая роля належыць калгаснай хаце-лабараторыі. Рыхтуючыся да асваення кок-сагыза, загадчык хаты-лабараторыі прачытаў многа літаратуры, уважліва вывучае ўказанні акадэміка Лысенка аб агратэхніцы каучуканоса.

— Кок-сагыз вось упершыню прыходзіцца сеяць, а пайзу, напрыклад, мы сеем некалькі год. На вопытным участку я нават прабаваў сеяць сою, — расказвае ён.

— І добра ўраджаіла яна?

— З невялікага ўчастка сабралі больш паўтара цэнтнера насення. Але вось што з ёй рабіць—не ведалі. Прышлося на корм свінням аддаць.

Асаблівую ўвагу ў гэтым годзе хата-лабараторыя аддала падрыхтоўцы да сяўбы насення. Значная плошча зернавых культур будзе засеяна яравізаваным насеннем. Таму загадчык загадзя раіцца са старшынёй, у якіх памяшканнях лепш праводзіць яравізацыю.

Потым гутарка заходзіць аб угнаеннях, як лепш іх скарыстаць, аб балотах, аб прадстаячых работах па карэннаму паляпшэнню пасбішчаў і сенажацей.

— Я лічу, — гаворыць старшыня, — што ў гэтым годзе мы маем усё неабходнае, каб зрабіць вялікі крок уперад па росту ўраджайнасці палёў і павышэнню прадуктыўнасці жывёлагадоўлі.

— Заручаю гэтаму, Сцяпан Лукіч, тое, што людзі надзвычай ужо моцна ўзяліся за работу, — устаўляе сваё слова Арцём. — Калі гэта было, каб у зімовы час у 4 гадзіны раніцы калгаснікі выязджалі на вывазку гною. А сёлета, бач, выязджалі.

— А ўсё-ж, Арцём, — працягвае старшыня, — супакайваюцца на гэтым нельга. У калгасе ёсць усе магчымасці, каб нястрымна рухацца наперад, развіваць і далей усе галіны грамадскай гаспадаркі...

Н. ВІШНЕЎСКІ.
С. КАЗНАЧЭЕЎ.

На ўздыме

Са Сцяпанам Лукічом — старшынёй праўлення арцелі — мы ідзем аглядаць грамадскую калгасную гаспадарку.

— Куды спачатку накіруемся? — пытае ён, на мінуту спыніўшыся сярод вуліцы, па якой булькаюць поўнаводныя вясеннія раўчакі.

— На конеферму...

— А потым?

— На птушкаферму, на МТФ, заглянем на аўчарню, на парнікі і так абыйдзем усю гаспадарку.

— О не, за дзень нашу гаспадарку не абыйдзеш, хіба на кані — тады другая справа...

І сапраўды, каб нават бегла аглядзець гаспадарку калгаса імені Дзержынскага, трэба патрацціць многа часу. Асабліва гэта нельга хутка зрабіць зараз, калі вясна сапсавала дарогі, а ад талых вод разліліся па нізінных землях, сенажацях і балотах рэчкі і канавы.

За апошні год-два нават у знешнім абліччы калгаса адбылися прыкметныя змены. Выраслі дзве вялікія і шырокія вуліцы. З хутароў сюды было сселена 125 двароў калгаснікаў. Многа пабудавана дабротных гаспадарчых будынкаў. Значна павялічылася пагалоўе грамадскай жывёлы.

Асабліва моцным штуршком да ўсебаковага развіцця арцельнай гаспадаркі з'явілася рашэнне партыі і ўрада аб змяненні ў палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў. Зараз для кожнага калгасніка ясна, што толькі зямля, навечна замацаваная совецкай дзяржавай за калгасам, з'яўляецца крыніцай багацця арцелі, росту заможнага і культурнага жыцця калгаснікаў. Чым больш рацыянальна і правільна будзе скарыстоўвацца кожны гектар зямельнай плошчы, тым хутчэй будзе расці эканоміка калгаса.

— Зямельны масіў нашай арцелі вялікі, — расказвае Сцяпан Лукіч. — Каб правільна, з найбольшым эфектам яго скарыстаць, трэба яшчэ многа папрацаваць.

Пасля апублікавання пастаноў партыі і ўрада аб далатковай аплаце працы і асушэнні беларускіх балот калгаснікі з новай энергіяй узяліся за павышэнне ўраджайнасці палёў і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, рыхтуюцца ператварыць балоты і забалочаныя землі ў высокаўраджайныя палі і сенажаці. Вясне ў калгасе падрыхтавана добрая сустрэча, калгаснікі гарэць жаданнем на працягу гэтага года дабіцца вялікага росту ўсіх галін арцельнай гаспадаркі.

«ГАМБІТ»

З капюшні на двор выскачыў рослы гадавалы жарэбчык. Ён настарожана застрыг вушамі, як-быццам прыслухоўваючыся, як на паплавах гудуць вясеннія воды, раптоўна сарваўся з месца і пабег па двару.

— «Байкал», «Байкальчык»! — ласкава пяклікаў яго загадчык племянной конетаварнай фермы Васілій Іванавіч Гук. Жарэбчык спыніўся каля калодзежа і павярнуў галаву ў бок загадчыка.

— Падабаецца, — з ноткай гонару ў голасе звяртаецца Васілій Іванавіч да нас. — Лепш за свайго бацьку «Гамбіта» будзе. Вось такімі вытворнікамі мы забяспечваем калгасы, добрых артылерыйскіх коней даем нашай Чырвонай Арміі.

«Гамбіт»—вытворнік пароды «брабансон» —гонар калгаснай конефермы. У яго ўжо вялікае патомства. У 1939 г. на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ён быў узнагароджан атэстатам трэцяй ступені. Апрача «Гамбіта» на конеферме ёсць яшчэ 6 вытворнікаў. За жарабцамі даглядае вопытны старшы конюх Сяргей Ефімавіч Крываль. Восем год працуе ён на ферме і за гэты час выгадаваў многа выдатных коней.

— Амаль ва ўсіх калгасах нашага і суседніх раёнаў ёсць жарабцы нашай гадоўлі, — гаворыць тав. Крываль.

З А Р У Б Я Ж О М

Водгукі замежнага друку на заключэнне совецка-японскага пакта аб нейтралітэце

ЯПОНІЯ

ТОКІО, 16 красавіка. (ТАСС). Японскі друк прадаўжае шырока каментыраваць пакт аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй.

Агенцтва Домей Цусін паведамляе, што японскі ўрад разгледзеў і адобрыў совецка-японскі пакт аб нейтралітэце і перадаў яго ў тайны совет. Мяркуюць, гаворыцца далей у паведамленні, што тайны совет у мэтах уважлівага, але быстрага разгляду пакта паскорыць працэдуру абмеркавання. Пакт будзе разглядацца не ў спецыяльнай камісіі, як гэта звычайна робіцца пры абмеркаванні падобных пытанняў, а адразу на пленарным пасяджэнні совета. Чакаецца, што тайны совет закончыць працэдуру абмеркавання пакта на працягу тыдня.

ГЕРМАНІЯ

БЕРЛІН, 16 красавіка. (ТАСС). Побач з сталічным друкам правінцыяльны друк Германіі жыва каментыруе заключэнне пакта аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй.

Газета «Франкфуртэр цэйтунг» піша, што ў рэзультаце благаразумных адносін да інтарэсаў абодвух старон «спрэчныя пытанні вырашаны мірным шляхам і ў кароткі тэрмін».

Газета «Нацыяналь цэйтунг» у перадавым артыкуле, прысвечаным пакту, указвае, што совецка-японскі пакт аб нейтралітэце знішчыць напружанасць, існаваўшую паміж СССР і Японіяй.

ТУРЦЫЯ

СТАМБУЛ, 16 красавіка.(ТАСС). Турэцкі друк прадаўжае ажыўлена каментываць совецка-японскі пакт аб нейтралітэце. «Вакыт», «Тан», «Джумхурыет» і «Ікдам» прысвячаюць гэтаму пакту перадавыя артыкулы. Газеты адзначаюць, што СССР прадаўжае рашуча следаваць палітыцы міру.

Газета «Вакыт» у перадавым артыкуле падкрэслівае, што заключэнне пакта з'яўляецца поспехам СССР.

«Джумхурыет» адзначае выгаднасць пакта для абодвух старон.

НАРВЕГІЯ

ОСЛО, 16 красавіка. (ТАСС). Усе нарвежскія газеты ўдзяляюць вялікую ўвагу падпісанню пакта аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй. Многія газеты апублікавалі вытрымкі з перадавога артыкула «Правды», прысвечанага пакту.

ФІНЛЯНДЫЯ

ХЕЛЬСІНКІ, 16 красавіка. (ТАСС). Вышаўшыя 15 красавіка ўпершыню пасля велікодных свят фінляндскія газеты на відным месцы апублікавалі поўны тэкст совецка-японскага пакта аб нейтралітэце, дэкларацыю, а таксама вытрымкі з перадавога артыкула «Правды», прысвечанага заключэнню пакта.

Вялікае месца газеты адводзяць замежным водгукам на заключэнне пакта.

ДАНІЯ

КАПЕНГАГЕН, 16 красавіка. (ТАСС). Дацкія газеты апублікавалі ўчора тэкст пакта аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй і дэкларацыю. (14 красавіка газеты не выйшлі ў сувязі з велікодныміі святамі).

АРГЕНТЫНА

НЬЮ-ЙОРК, 16 красавіка. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс з Буэнос-Айрэса, поўны тэкст совецка-японскага пакта аб нейтралітэце і дэкларацыя апублікаваны на відным месцы ўсімі аргентынскімі газетамі.

ВЕНГРЫЯ

БУДАПЕШТ, 16 красавіка. (ТАСС). Венгерскі друк шырока адгукаецца на пакт аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй. Бюлетэнь «Будапешці эртэсіце» піша, што пакт выходзіць з інтарэсаў абодвух старон і з'яўляецца значнай палітычнай падзеяй.

ІРАН

ТЭГЕРАН, 16 красавіка. (ТАСС). Усе тэгеранскія газеты апублікавалі поўны тэкст совецка-японскага пакта аб нейтралітэце і дэкларацыю.

ЧЫЛІ

НЬЮ-ЙОРК, 16 красавіка. (ТАСС). Чылійскі друк апублікаваў паведамленне аб пакце аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй.

Газета «Эль сіглО» заяўляе: пакт паказвае, што Совецкі Саюз змагаецца і будзе змагацца за мір.

РУМЫНІЯ

БУХАРЭСТ, 16 красавіка. (ТАСС). Румынскі друк удзяляе вялікую ўвагу совецка-японскаму пакту аб нейтралітэце.

Газета «Алцыуняя», каментыруючы совецка-японскі пакт, піша, што пакт з'явіцца асновай дружбы двух дзяржаў.

Вайна ў Еўропе і Афрыцы

(Дзённік ваенных дзеянняў)

На балканскім фронце, у Югаславіі, прадаўжаюцца баі ў раёне Сараева. Германскія войскі, указваецца ў зводцы германскага камандавання, зламалі ў гэтым раёне супраціўленне югаслаўскіх войск. У Далмацыі, адзначаецца ў італьянскай зводцы, італьянскія войскі прасунуліся з боку албана-югаслаўскай граніцы ў паўночным напрамку і занялі Антывары і Пэцінье (пералёка ад граніцы). Калоны другой італьянскай арміі ідуць ад Сплітa на поўдзень да Рагузе (Дуброўнік) з тым, каб злучыцца з італьянскімі войскамі, наступаючымі з поўдня.

На грэчаскім участку фронта германскія войскі, паводле германскай зводкі, занялі пункт Серыя (Паўночная Грэцыя). У зводцы грэчаскага камандавання ўказваецца, што ў Заходняй Македоніі германскія часці, пранікшыя ў даліну ракі Вістрыца (Галіакмон), дзейнічаюць у раёне Грэвены, імкнучыся пранікнуць да Калабакі. На плато Козані германскія войскі прасунуліся на поўдзень ад Вістрыцы. У камунікеі грэчаскага міністэрства дзяржаўнай бяспечнасці гаворыцца, што 16 красавіка германская авіяцыя падвергла бамбардыроўцы розныя пункты ў заліве ля вострава Эўбея. Бамбардыроўцы падвергся таксама горад Наксос (на востраве тойжа назвы). Грэчаскія газеты паведамляюць, што 15 красавіка войскі саюзнікаў адышлі на новыя пазіцыі. Пачаўшыяся 14 красавіка ў Заходняй Македоніі баі ў поўным разгары. Германскія мотамеханізаваныя часці, прайшоўшы Козані і Сіатысту, выйшлі да заходняга краю горнага праходу Сіатыста. У Цэнтральнай Македоніі грэкі ўпорна абараняюцца і наносяць германскім войскам страты. На правым участку фронта, на лініі англійскіх войск, немцы зрабілі атакі, кінуўшы ў бой значныя мотамеханізаваныя сілы. Усе атакі былі адбіты.

У Албаніі італьянскія войскі, згодна камунікеі грэчаскага камандавання, занялі цясніну Кіафе ў раёне на поўдзень ад Корчы. У італьянскай зводцы паведамляецца, што часці 11-й італьянскай арміі занялі пасля жорсткага бою Блісуру (Паўднёвая Албанія).

На англа-германскім фронце зноў узмацнілася актыўнасць германскай авіяцыі. У ноч на 17 красавіка, паведамляецца ў зводцы германскага камандавання, германскія паветраныя сілы зрабілі вялікі налёт на Лондан. Шматлікія эскадрыллі германскай авіяцыі на працягу ўсёй ночы безупынна скідалі фугасныя бомбы ўсіх калібраў, а таксама запальваючыя бомбы.

Лонданскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што апошні налёт на Лондан быў найбольш жорсткім з усіх налётаў на сталіцу з пачатку вайны. Як у самым Лондане, так і ў Лонданскім раёне ёсць велізарныя разбурэнні.

16 красавіка англійскія ваенна-паветраныя сілы прадпрынялі новы налёт на востраў Баркум і востраў Гельголанд. У ноч на 17 красавіка, перадае англійскае міністэрства інфармацыі, англійскія самалёты зрабілі налёт на аэрадромы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Паўночнай Францыі. Бамбардыроўцы падвергся таксама Брэст (Францыя). У тую-ж ноч злучэнні англійскай авіяцыі атакавалі Брэмен, Вільгельмсхафен, Куксхафен.

* * *

Узмацнілася актыўнасць англійскага флота ў Міжземным моры. Англійскія ваенна-марскія сілы, якія аперыруюць у заходняй частцы Міжземнага мора, перадае агенцтва Рэйтэр, зрабілі ў ноч на 16 красавіка напад на караван італьянскіх суднаў, які складаўся з пяці транспартных параходаў, іншоўшых пад эскортам трох эсмінцаў з Сіцыліі ў Трыполі. Усе пяць параходаў былі затоплены. Італьянскія судны ішлі пад канвоем эсмінца «Лука Тарыго» водазмяшчэннем у 1688 тон і двух эсмінцаў меншага танажа. Усе тры эсмінцы таксама затоплены.

У Паўночнай Афрыцы аперацыі разгортваюцца, паводле італьянскай зводкі, на лівійска-егіпецкай граніцы, у раёне Салума. Каірскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, спасылаючыся на англійскія ваенныя кругі, перадае, што германскія перадавыя часці ўжо на працягу трох дзён знаходзяцца на лівійска-егіпецкай граніцы і не прабуюць прасоўвацца далей на ўсход. Карэспандэнт указвае, што немцы не прабавалі зноў атакаваць Тобрук, які ўтрымліваецца англійскім гарнізонам.

У сувязі з наступленнем італа-германскіх часцей у Афрыцы, англійская газета «Ньюс кронікл» выказвае апасенне, што праціўнік, захапіўшы новыя аэрадромы, будзе падвяргаць бамбардыроўкам Александрыю і Суэцкі канал. Газета лічыць, што бой, які ідзе за Афрыку, ніякім чынам не павінен быць прайграным, бо вынік гэтага бою можа мець далёка ідучыя рэзультаты.

Ва Усходняй Афрыцы англійскія войскі, як паведамляе карэспандэнт агенцтва Рэйтэр з Адыс-Абебы, прадаўжаюць праследаваць адступаючыя італьянскія часці, якія сканцэнтрыраваліся ў трох асноўных пунктах — ля перавала Мусаліні (за 150 кілометраў ад Адыс-Абебы на дарозе, што вядзе ў Дэсі), у горах Арусі (на ўсход ад Абісінскіх азёр) і ў раёне ракі Омо—па дарозе к Джыме. У камунікеі англійскага камандавання ўказваецца, што ў сучасны момант колькасць італьянскіх войск у Абісініі вызначаецца, прыблізна, у 40 тысяч італьянцаў і 36 тысяч каланіяльных салдат. Паводле італьянскай зводкі, баі адбываліся ля ракі Баро (Заходняя Абісінія) і на захад ад Сайо (на поўнач ад Гамбелы).

17 красавіка. (ТАСС).

Юныя мічурынцы Мінскага палаца піонераў высаджваюць у парнікі расаду памідораў. На пярэднім плане вучаніца 4-га класа 1-й школы Сара Маршак.

Фото М. Мінковіча.

Тэатр „РОЗЫ ДЖАЙПУРА"

(Дзяржаўны тэатр музыкальнай камедыі БССР)

Атульнавядомая аперэта Эмерыха Кальмана «Баядэра», напісаная кампазітарам у 1921 годзе, у новым лібрэта перайменавана ў «Розы Джайпура».

У новым лібрэта завостраны соцыяльныя матывы, але тэкст стаў менш астраумным. Ён пазбаўлен камедыйнай лёгкасці, стаў даволі сухім і схематычным ці, прасцей кажучы, сумным. А што можа быць горш за сумную аперэту?!

На працягу ўсяго спектакля з сумам змагаецца перш за ўсё сам кампазітар сваёй выдатнай музыкай і па меры сваіх магчымасцей асобныя акторы. Рэжысура, на жаль, менш за ўсіх паклапацілася аб стварэнні вясёлага і жыццерадаснага аперэтачнага спектакля.

«Баядэра», таксама як «Сільва» і «Марыца», належаць да лепшых твораў класіка венскай аперэты. Тры выдатных аперэты Кальмана прадстаўляюць сабой у пэўнай меры варыянт «Травіяты» Вердзі, але з паралельнай «каскаднай» інтрыгай, якая з'яўляецца асаблівасцю жанра. Востра-драматычныя калізіі ў «Баядэры» спалучаюцца з буфанадай.

Уласцівасцю кальманаўскіх аперэт з'яўляецца і тое, што ў іх дамініруе не «каскадная» інтрыга, хоць і бліскучэ распрацаваная. Тэма любві з'яўляецца асновай «Баядэры», «Сільвы» і «Марыцы». Героі гэтых аперэт перажываюць, пакутуюць, нават перамагаюць цяжкасці ў барацьбе за любоў. У музыкальных вобразах аперэт Кальмана ёсць драматызм, непасрэднасць пачуцця. Музыкальныя тэмы ў «Баядэры» будуюцца на венгерска-цыганскіх напевах, надзвычай меладычных і пачуццёвых. Гарманічная распрацоўка музыкальных тэм, прынцыпіальнае інструментоўкі, тэмпы ўсялякім чынам падкрэсліваюць гэтую пачуццёвасць.

Значную ролю адыгрываюць у аперэтах Кальмана хор, ансамблі і фіналы, у якіх адчуваецца тонкі мастацкі густ кампазітара і добрае валоданне жанрам.

Глыбока тэатральная музыка Кальмана павінна быць з сапраўдным пранікненнем раскрыта ў спектаклі.

Мы шчыра прызнаёмся, што спектакль «Розы Джайпура» ў Дзяржаўным тэатры музыкальнай камедыі БССР (пастаноўка В. Ленскага, дырыжор Б. Постнікаў) нас расчараваў. Спектакль у многім не можа задаволіць гледача.

Найлепшае ўражанне стварае вакальны бок партыі Кэці Перль у выкананні артысткі Л. Адамантавай. Паяўленне гэтай артысткі, скончыўшай Беларускую кансерваторыю, у нашым аперэтачным тэатры павінна садзейнічаць узняццю яго вакальнай культуры.

Л. Адамантава—спявачка з прыемным, цёплага і мяккага тэмбра голасам. Яе дуэты з прынцам Джайпура (артыст Ю. Рубінштайн) насычаны глыбокім пачуццём, даходзяць у асобных месцах да драматычнага гучання. Але ў Адамантавай яшчэ мала сцэнічнага вопыту. Яна яшчэ слаба ў ігравых эпізодах—тут ёй нехапае аперэтачнай лёгкасці і жывасці.

Нельга даравать абыякавасць да сцэнічнага рысунка вобраза больш вопытным акторам. Мы гаворым аб Ю. Рубінштэйне — выканаўцы ролі прынца Джайпура (прынц Раджамі — у старой рэдакцыі «Баядэры»). Артыст, які даўно працуе на аперэтачнай сцэне і мае пэўныя здольнасці і добрыя знешнія якасці, неабходныя «герою», знаходзіцца ў палоне правінцыяльнага штампа. Ёсць пэўныя рысы, якімі прынц Раджамі—Джайпур адрозніваецца ад князя Эдвіна Валяпюка і іншых аперэтачных герояў. Гэтыя рысы можна знайсці не толькі ў чорным твары прынца і экзатычным убранні яго галавы, а перш за ўсё ў музыцы Кальмана.

Але па спектаклю не відаць, каб Рубінштэйн шукаў гэтыя характэрныя штрыхі ролі. І вакальная старана партыі ў Рубінштэйна не на высокім узроўні. Ёсць дэфекты ў манеры спявання, адсутнічае чыстата гуку на высокіх і нізкіх рэгістрах.

Больш выразна раскрыта ў спектаклі «каскадная» інтрыга. Даволі жыва, але без асаблівага блеску ідзе «каскадную» ролю Сюзі артыстка Е. Папко. Артыст Г. Гераскін ролю Боні («Сільва») сыграў больш тэмпераментна чым Шарля Бурыдана ў «Розах Джайпура». Артыст тут абмежаваны не зусім астраумным тэкстам ролі Шарля. Менш цікавы тут чым у радзе іншых спектакляў («Вяселле ў Малінаўцы», «Роз-Мары») А. Астахаў. У гэтым зноў-такі менш вінават актор, а больш лібрэта, якое пазбаўлена бліскучага, іскрамётнага юмара.

Слаба гучаць у спектаклі хоры, невыразны па дыкцыі і фразіроўцы ансамблі.

Вакальная, як і ўся музыкальная частка спектакля не на належнай вышыні.

Нельга сказаць аб якіх-небудзь значных удачах рэжысуры, аб пошуках выхаду з надакучыўшага аперэтачнага трафарэта. Хор і кордэбалет рэжысёрам не скарыстаны для ўзбагачэння сцэнічных фарб спектакля. Статычнасць гэтых калектываў — адна з прычын суму, якім павявае ад спектакля. У асобных месцах рэжысура, па нашай думцы, нават антымузыкальна, — мы маем на ўвазе дуэты і арыі, якія спяваюцца «ў кулісы», заглушаючы і без таго слабыя галасы некаторых выканаўцаў. Не ўзрадаваў гледачоў свежым афармленнем і мастак Б. Дуракоў.

Мы павінны з жалем адзначыць, што Беларускі тэатр музыкальнай камедыі топчыцца на месцы і не прымае сур'ёзных захадаў для палепшання якасці сваіх спектакляў.

М. МОДЗЭЛЬ.

ЗБОРНІК „АБ ЛЕНІНЕ"

Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР выпусціла з друку на беларускай мове зборнік «Аб Леніне».

У зборнік змешчаны творы «Аб Леніне» І. В. Сталіна, «Успаміны аб Леніне» Н. К. Крупскай, «В. І. Ленін» М. Горкага, урыўкі з кнігі «Сталін» Анры Барбюса, «У шалашы» З. Бядулі, «Ленінская праўда» (беларуская казка) і інш.

Зборнік выпушчан тыражом у 5 тысяч экземпляраў. Аб'ём яго — 11,5 друкаваных аркушаў.

Праз некалькі дзён выходзіць з друку на польскай мове брашура «Першае мая» (зборнік артыкулаў) В. І. Леніна.

Новыя дасягненні мінскіх плаўцоў

Рыхтуючыся да прадстаўчай у Маскве сустрэчы па плаванню 6 гарадоў, мінскія плаўцы на вучэбна-трэніровачным зборы дабіліся выдатных дасягненняў. Юны плавец Крукаў Нікалай праплыў дыстанцыю ў 800 метраў вольным стылем за 10 мінут 33 секунды, перакрыўшы на 1,6 секунды стары рэкорд заслужанага майстра спорта СССР тав. Кітаева (Ленінград).

Новага ўсесаюзнага дасягнення дабілася таксама ўдзельніца каманды Пілкоўская Валя. У комплексным плаванні 3 × 50 (на спіне, брасам і кролем) яна паказала час 2 мінуты 34,5 секунды.

Значна палепшылі рэспубліканскія рэкорды тт. Дурэйка (Дом Чырвонай Арміі) у заплыве брасам на 200 метраў, Іванова (Дом Чырвонай Арміі) — 50 метраў з гранатай, Сімакова (таварыства «Дынамо») — 500 метраў вольным стылем і Абросімава (тэхнікум фізкультуры)—200 метраў на спіне.

Паркі культуры і адпачынку к лету

У гэтым годзе на ўпарадкаванне паркаў Мінска адпушчана каля 300 тысяч рублёў. Ужо зараз разгарнуліся вялікія работы. У парку культуры і адпачынку імені Горкага абсталёўваецца пляцоўка, на якой будзе пабудавана вялікая мастацка аформленая эстрада. Пераабсталёўваецца падыход і да Зялёнага тэатра.

Значна палепшыцца тэрыторыя велатрэка. У бягучым сезоне яна адводзіцца спецыяльна для любіцеляў веласпорта. Будуецца балюстрада, устанаўляюцца жалезныя скамейкі, атракцыёны — лятаючыя людзі, калясо смеху, пляцоўкі для масавых ігр і танцаў.

Асаблівая ўвага аддаецца азеляненню парка. На гэтыя мэты асігнавана 30.000 рублёў.

Многа цікавага знойдуць у парку юныя наведвальнікі. Для іх арганізуюцца спецыяльная дзіцячая чытальня, каруселі.

Вялікая падрыхтоўка да летняга сезона разгарнулася таксама ў парку культуры і адпачынку па Пушкінскай вуліцы. Тут рамантыруецца эстрада, салярый, устанаўляюцца атракцыёны, гадатковыя бяседкі, скамейкі і інш.

Паркі сталіцы БССР намечана адкрыць у першых чыслах мая.

Пачалася навігацыя

МАГІЛЕЎ, 17 красавіка. (БЕЛТА). У раёнах Магілева, Оршы і Лоева Дняпр ачысціўся ад ільду. У першы рэйс Магілеў—Дуброўна павялі баржы буксірныя параходы «Пяцігодка» і «Праўда».

Паводка ідзе на ўбыль

Самы вялікі пад'ём вады ў рацэ Свіслач быў раніцою 16 красавіка. Да 12 гадзін узровень яе дайшоў да 457 сантыметраў.

Учора з 12 гадзін дня вада пачала ўбываць. Ужо да 17 гадзін узровень яе знізіўся да 423 сантыметраў. Зніжэнне прадаўжаецца.

Адказны рэдактар М. К. АСТАПЕНКА.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

20 красавіка раніцай спектакль для школьнікаў «ДОН-КІХОТ». Пачатак у 12 г. дня.

Бліжэйшая прэм'ера КАЗКІ ГОФМАНА

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

18 красавіка ДУРА ДЛЯ ІНШЫХ, РАЗУМНАЯ ДЛЯ СЯБЕ. Пачатак у 8 г. веч.

Акруговы Тэатр Чырвонай Арміі ЗахАВА — Гастролі Дзяржаўнага Тэатра музкамедыі БССР. 18 красавіка БАЯДЭРА. Пачатак у 8 г. вечара.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР. 19 красавіка «КОЛДУНЬЯ». Пачатак у 8 г. веч.

Кінатэатр «Чырвоная зорка» БАГДАН ХМЕЛЬНІЦКІ. Пачатак у 5.15. 7.15 9.15 і 11 г. веч.

Дзіцячы кінатэатр. Дзённыя сеансы САРАЧЫНСКАЯ ЯРМАРКА. Вячэрнія сеансы для дарослых САРАЧЫНСКАЯ ЯРМАРКА

Кінатэатр «Родина» СВЯТА СВЯТОГА ЮРГЕНА

Кінатэатр «Інтэрнацыянал» «ВРАТАРЬ»

Кінатэатр «Спартак» дакументальны фільм НАСУСТРАЧ СОНЦУ

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ

КАНЦЭРТНЫ ЗАЛ (рог вул. Урыцкага і Карла Маркса, 21/13)

20 красавіка. КАНЦЭРТ для студэнтаў і старшых школьнікаў «ПУШКІН У МУЗЫЦЫ»

У КАНЦЭРЦЕ ЎДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ: СІМФАНІЧНЫ АРКЕСТР

Дырыжор ордэнаносец К. А. СІМЕОНАЎ, заслуж. арт. БССР

Л. Ф. АЛЯКСЕЕВА (сапрано).

Саліст Дзяржаўнага ордэна Леніна Вялікага тэатра оперы і балета БССР В. І. ТАЛАНКІН (бас).

Артыстка Першага Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра З. І. БРАВАРСКАЯ (мастацкае чытанне).

Канцэртмейстар А. І. ЖЭЗМЕР.

Уступнае слова Б. Н. ГРЫМБЛІТ.

У ПРАГРАМЕ: творы кампазітараў Чайкоўскага, Рымскага-Корсакава, Даргамыжскага, Мусаргскага і іншых.

Пачатак у 2 гадзіны дня. Цана білета ад 3 руб. да 1 руб.

Білеты ў касе канцэртнага зала з 12 да 2 і з 5 да 9 гадз. вечара.

АРЦЕЛЬ „ЧЫРВОНЫ АБУТНІК"

ПРЫМАЕ розныя ЗАКАЗЫ на пашыўку АБУТКУ З МАТЭРЫЯЛА ЗАКАЗЧЫКА

ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА ДОБРАЯКАСНА І Ў ТЭРМІН.

Адрас арцелі: Пролетарская, 50; тэл. 22-8-60.

МІНСКІ ГОРФІНАДДЗЕЛ напамінае ГАЛОЎНЫМ (старшым) БУХГАЛТАРАМ усіх устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый гор. Мінска, НЕ ПРАДСТАВІЎШЫМ СПРАВАЗДАЧЫ за I квартал бягучага года «АБ УТРЫМАННІ ПАДАХОДНАГА ПАДАТКУ І КУЛЬТЗБОРУ ПА ЗАРПЛАЦЕ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ» (ф. № 47-а), што тэрмін для яе прадстаўлення скончыўся 10 красавіка г. г.

БЛАНКІ СПРАВАЗДАЧЫ ВЫДАЮЦЦА РАЙГОРФІНАДДЗЕЛАМІ.

ЗА НЯСВОЕЧАСОВАЕ ПРАДСТАЎЛЕННЕ СПРАВАЗДАЧ ВІНОЎНЫЯ ПАДВЯРГАЮЦЦА ШТРАФУ ДА 100 РУБ.

МІНФАРФА.

МІНСКАЙ ВОЙЛАЧНАЙ ФАБРЫЦЫ «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» ПАТРЭБНЫ: КАСІР, СЛЕСАРЫ, КАЧАГАРЫ, СТОЛЯРЫ, ТОКАРЫ, ШОРНІКІ, РАБОЧЫЯ на машынах у цэхі і ПАДСОБНЫЯ РАБОЧЫЯ.

Звяртацца ў аддзел кадраў фабрыкі — Мінск, Калгасная, 67.

ВЫДАВЕЦТВУ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» ПАТРЭБНЫ: ПІВЕЙЦАРЫ І ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ.

Звяртацца: Совецкая, 49, II паверх, пакой 6.

ДРУКАРНІ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» ПАТРЭБЕН ВОЦЫТНЫ РАХУНКАВОД.

Звяртацца: Совецкая, 49, II паверх, пакой 8.

МІНСКАМУ АЎТАРАМОНТНАМУ ЗАВОДУ ПАТРЭБНЫ: НАЧАЛЬНІК АДДЗЕЛА ТЭХНІЧНАГА КАНТРОЛЮ (пажадана інжынер або тэхнік, які ведае механічную апрацоўку і аўтамашыны), ЗАГАДЧЫК ВЫТВОРЧАСЦІ, ІНЖЫНЕР-ТЭХНОЛАГ, ТЭХНІК-КАНСТРУКТАР, ТОКАРЫ 3, 4, 5 і 6 разрадаў, высококваліфікаваныя СЛЕСАРЫ па рамонту станкоў, ДЭФЕКТЫРОЎШЧЫКІ, добра знаёмыя з аўтадэталямі ГАЗ-АА, НАЧАЛЬНІК ПАЖАРНА-СТАРАЖАВОЙ АХОВЫ.

Звяртацца: Мінск, Магілеўскае шасе, 8.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 20-844

ЗНІШЧАЙЦЕ ЛІЧЫНКІ СКУРНАГА АВАДНЯ

Авадзень, паражаючы рагатую жывёлу, штогод прыносіць народнай гаспадарцы страты на дзесяткі мільёнаў рублёў.

АБАВЯЗАК КОЖНАГА КАЛГАСА І СОЎГАСА, КОЖНАГА КАЛГАСНІКА І АДНААСОБНІКА ЗМАГАЦЦА З ГЭТЫМ БУЙНЕЙШЫМ ШКОДНІКАМ РАГАТАЙ ЖЫВЁЛЫ

ДЛЯ ЗНІШЧЭННЯ АВАДНЯ ЁСЦЬ ТРЫ СПОСАБЫ:

1) упырскванне ў жаўлакі з лічынкамі лекавых валкасцей;
2) упіранне ў жаўлакі лекавых мазей і
3) выдаўліванне лічынак рукамі і іх знішчэнне (выдаўленыя лічынкі раздаўліваюць, спальваюць або кідаюць у вядро з карасінам).

Першыя два спосабы могуць прымяняцца толькі ветперсаналам або пад яго кіраўніцтвам.

САМЫ ПРОСТЫ СПОСАБ: выдаўліванне лічынак рукамі

Паводле Ветарынарнага статута Саюза ССР—п. 2. літ. «д», кіраўнікі гаспадарак, дзе ёсць жывёла, і ўладальнікі жывёлы АБАВЯЗАНЫ ВЕСЦІ БАРАЦЬБУ З СКУРНЫМ АВАДНЕМ.

Пры невыкананні гэтага, згодна п. 37 таго-ж статута, на віноўных накладаецца ШТРАФ ДА 300 РУБ.

ПОМНІЦЕ: знішчаючы авадня, мы пазбаўляем нашу краіну ад многамільённых страт, захоўваем для прамысловасці мільёны скур, а для насельніцтва—мільёны літраў малака, дзесяткі тысяч тон мяса і мільёны пар абутку.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА «ЗАГОТЖИВСЫРЬЕ».

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 2-00-00 (камутатар), дадатковы — 102, прыёмная рэдактара — 2-13-52, намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88, адказны сакратар—2-13-53, намеснік адказнага сакратара — 2-13-99, сакратарыят — 2-39-55, аддзелаў: загадчык партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, загадчык эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56, літработнікаў па літаратуры, мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце, унутранай інфармацыі — 2-18-85, аддзел рабселькораў і пісем працоўных — 2-13-60, заг. выдавецтва — 2-13-58, бухгалтарыя выдавецтва і аддзел аб'яў — 2-08-44, выпускаючы — 2-47-68, карэктарская — 2-13-57.

У 1920 Друкарня газеты «Звязда». К., М., М.